

СЦЯГ ПЕРАМОГІ НАД ГАРАДКОМ

4-5

ПРЭМ'ЕРА НА КУПАЛАЎСКАЙ СЦЭНЕ

11




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 СТУДЗЕНЯ 2024 г. СУБОТА № 4 (30138)


# МЫ АДКРЫВАЕМ СЭРЦА ТЫМ, ХТО ПРЫХОДЗІЦЬ З МІРАМ

*Праваслаўным хрысціянам Беларусі*

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Раством Хрыстовым.

Гэта светлае свята дорыць вернікам надзею на духоўнае збаўленне, вучыць бязмежнай любові і ахвярнасці ў імя бліжняга.

Хрысціянскія спачуванне і клопат, прастата і добразычлівасць даўно сталі культурным набыткам беларускага народа. Мы адкрываем сэрца тым, хто прыходзіць з мірам, і самі гатовы дзяліцца з тымі, хто жыве ў нястачы, хлебам і прытулкам.

Перакананы, захоўваючы праваслаўныя традыцыі міласэрнасці і маральнай чысціні, разам мы створым найлепшую будучыню для роднай Беларусі.

Няхай Калядны сачэўнік напоўніць вашы дамы душэўнай цеплынёй, шчырасцю пачуццяў і ўзаемаразуменнем, а радасць гэтых святочных дзён натхніць на новыя стваральныя здзяйсненні ў новым годзе.

Жадаю ўсім здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ ПАВІННЫ ПЕРАЎЗЫСЦІ СЯБЕ»

**А для гэтага кожны на сваім месцы павінен працаваць якасна і аддана**



Фота БелТА.

**Першая рабочая нарада ў Прэзідэнта Беларусі задала тон усяму году, які аб'яўлены Годам якасці. У Палацы Незалежнасці абмеркавалі асноўныя кірункі работы па павышэнні якасці ва ўсіх сферах.**

### «Тавар павінен быць унікальным і канкурэнтаздольным на міжнародных рынках»

Перш чым перайсці да абмеркавання пытанняў якасці, Прэзідэнт азнаёміўся з міні-выставай «Знак якасці: традыцыя мінулага і сучаснасці», якая была арганізавана ў Палацы Незалежнасці. На экспазіцыі сваю прадукцыю прадставілі беларускія прадпрыемствы, якія ва ўсе часы сваёй дзейнасці прытрымліваюцца высокіх стандартаў якасці. У савецкі час прадукцыя гэтых прадпрыемстваў ужо была ўдастоена Знака якасці, яе ўзоры былі размешчаны на стэндах выстаўкі. На выстаўцы ў Палацы Незалежнасці кіраўнікі і ветэраны прадпрыемстваў прадставілі Прэзідэнту ўзоры, якія прэтэндуюць на сучасны Знак якасці. У гэтым пытанні пераемнасць пакаленняў — надзвычай важная.

На першым стэндзе прадстаўлена легендарнае прадпрыемства. Сяргей Лесін, выконваючы абавязкі гендырэктара ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-Холдынг», адзначыў, што ў 1967 годзе Знак якасці СССР быў прысвоены мадэлі БелАЗ 540. Сёння кампанія разлічвае атрымаць Дзяржаўны знак якасці Беларусі за мадэль БелАЗ 7513 (грузападымальнасцю 130—136 тон), якая выпускаецца з 1996 года. Сёння ў свеце 8 з 10 кар'ерных самазвалаў такой грузападымальнасці, якія прадаюцца, — машыны БелАЗ. Намеснік прэм'ер-міністра Пётр Пархомчык далажыў, што такія мадэлі выпускаюць усе канкурэнты БелАЗа, але менавіта ў гэтай нішы (130—136 тон) беларускія аўтамабілебудаўнікі — безумоўныя лідары.

«Гэтую мадэль у народзе называюць «аўтамат Калашнікава». Сібіракі такую адзнаку даюць: надзейнасць, безадмоўнасць, прастата ў абслугоўванні, эксплуатацыі і, самае галоўнае, эфектыўнасць у частцы прадукцыйнасці і нізкіх эксплуатацыйных выдаткаў. Сёння яна прадстаўлена ў 12 мадыфікацыях і 140 выкананнях», — расказаў Сяргей Лесін.

СТАР. 2-3

КОРАТКА

• **Золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 студзеня склалі $8,127 млрд.**

• Кітай, Азербайджан і Расія сталі найбуйнейшымі пакупнікамі піламатэрыялаў на БУТБ у 2023 годзе.

• **ДАІ рэкамендуе вадзіцелям кіраваць аўто стрымана і акуратна ў складаных умовах надвор'я.**

ISSN 1990 — 763X

Правілы жыцця

# «ЯНЫ АДБЫВАЮЦЦА З ТЫМІ, ХТО Ў ІХ ВЕРЫЦЬ»

**Развагі вясковага доктара пра цуды**



Каб стварыць сабе і пацыентам настрой, унутры амбулаторыі зрабілі святочную фотазону.

**З загадчыкам Язненскай амбулаторыі ўрачом агульнай практыкі Уладзімірам ПАШКОВІЧАМ мы сустрэліся напярэдадні Каляд. Ён з самага ранку паспеў наведаць царкву, дзе ўжо шмат гадоў спявае на клірасе. І адразу ж рушыў на рэпетыцыю ў мясцовы Дом культуры, які месціцца праз дарогу ад храма. Менавіта там я і сустрэла Уладзіміра Пятровіча... у касцюме Дзеда Мароза. Пасля рэпетыцыі мы паехалі да яго дадому, дзе доктар пачаставаў мяне самапечаным жывым хлебам, і паразмаўлялі пра цуды ў яго жыцці.**

### Пра веру, Маці Божую ды другое нараджэнне

Ці веру я ў цуды? А як жа ж! Калі чалавек верыць у Бога, а цуды здзяйсняюцца Боскай сілай, значыць ён верыць і ў цуды. Калі ён верыць у цуды, значыць яны з ім абавязкова будуць адбывацца. Проста іх трэба прыкмячаць.

**Пра цуд, які здарыўся са мной у пазамінулым годзе перад Калядамі, я яшчэ нікому не расказваў.** 6 студзеня я прыйшоў з вячэрняй службы ў царкве. І вось трэба накрываць на стол, а я разумею, што ў мяне няма сена, каб падкласці пад абрус. Я згадваю, што бабуля казала, што сена — гэта праобраз калыскі, у якой ляжаў немаўлятка Ісус Хрыстос, што яно патрэбна для таго, каб у гэтую святую ноч у дом прыйшла Маці Божая. Ну вось, думаю, не прыйдзе да нас. Заходжу ў адзін з пакояў, а там такі прыемны пах, нейкі незямны. Я адразу ж паклікаў жонку, маўляў, «ты чымсьці тут папырскала?» — «Не, — кажа, — нічога не рабіла». І я зразумеў, што гэта прыходзіла Маці Божая, каб супакоіць мяне, сказаць, што наведала наш дом.

СТАР. 7

# «МЫ ПАВІННЫ ПЕРАЎЗЫСЦІ СЯБЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Побач — яшчэ адна прамысловая легенда — Мінскі трактарны завод. Яго візітная картка — трактар Belarus — быў удастоены савецкага Знака якасці. Як расказаў генеральны дырэктар ААТ «Мінскі трактарны завод» Віталь Воўк, тады мадэль МТЗ-50 была самай масавай, выпускалася ў Ташкенце і ў Тбілісі, але была распрацавана беларускімі спецыялістамі. Віталь Воўк прадставіў Прэзідэнту мадэль трактара Belarus1222.3, якая прэтэндуе на атрыманне сучаснага Дзяржаўнага знака якасці. Гэтая мадэль больш тэхналагічная і камфортная для працы, чым савецкі папярэднік. Але варта адзначыць, што частка вузлоў пакуль яшчэ імпартнай вытворчасці. Аляксандр Лукашэнка спытаў, калі гэты трактар будзе поўнасцю айчынным. Генеральны дырэктар МТЗ запэўніў, што на працягу двух гадоў гэта пытанне будзе вырашана.

***«БЕЛАЗы, МТЗ, МАЗ і гэтак далей — яны не могуць не мець знака якасці на нейкі свой тавар. Але гэты тавар павінен быць унікальным, ён павінен быць канкурэнтаздольным на міжнародных рынках, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Бездакорная павінна быць тэхніка. Мы і правяраць будзем. Проста штампаваць вам знак якасці на кабіну, капот ці на шкло не будзем, інакш мы зганьбім краіну».*** Прэзідэнт заўважыў, што беларускія прадпрыемствы выпрацоўваюць добрую прадукцыю, але для Знака якасці трэба лепшая.

Мінскі маторны завод прапануе на прысваенне Знака якасці серыю малалітражных рухавікоў 3.4. Сучасныя рухавікі ў паўтара раза меншыя па вазе, чым рухавік д-50, які атрымаў Знак якасці ў 1971 годзе, але і ў столькі ж разоў пераўзыходзяць па магутнасці савецкую мадэль. «Мы дамаўляліся, што маторны завод зробіць нам рухавік для камбайнаў, самы магутны, які ў нас ёсць», — нагадаў кіраўнік дзяржавы. «Сёння рухавікі для камбайнаў закупляюць у расійскіх і кітайскіх вытворцаў. Пры гэтым ММЗ выпускае рухавікі, якімі ўдалося замясціць імпартныя, прычым вельмі знакамітыя, і якія сёння не выпускаюць у Расіі», — адказаў Пётр Пархомчык.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што Мінскі маторны завод павінен вырашыць пытанні з рухавікамі, якія стаяць перад беларускімі прадпрыемствамі. Напрыклад, МТЗ неабходны рухавік магутнасцю 350—500 к. с. Кіраўніцтва ММЗ паабяцала, што за два гады такі беларускі рухавік з'явіцца, патрэбен час, каб распрацаваць тэхналогіі. «Вельмі сур'ёзны будзе падыход. Гэта не дзеля іміджу», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Генеральны дырэктар Мінскага маторнага завода прывёз у Палац Незалежнасці запіс, які Аляксандр Лукашэнка пакінуў падчас свайго першага наведвання прадпрыемства 23 верасня 1994 года. «Упершыню адчуў за апошні час: прарвёмся. Перакананы!» — напісаў тады беларускі лідар.

20 з 25 мадэляў электронных ручных гадзінікаў, якія былі выраблены ААТ «Інтэграл», удастоены савецкага Знака якасці. Паўтарыць іх дасягненне сёння збіраецца мадэль «Дзюна-5017», таксама на гэта прэтэндуюць некаторыя віды транзістараў і дыёдаў.

«У мінулым годзе кожны другі тэлевізар, прададзены ў ЕАЭС, быў выраблены на прадпрыемстве «Гарызонт». Гэта проста цудоўны вынік усяго калектыву. У Савецкім Саюзе максімальны аб'ём, які быў дасягнуты, — 1,8 мільёна, мы сёлета прадаём больш за 3 мільёны — у тры разы перавысілі аб'ёмы вытворчасці часоў Савецкага Саюза. З году ў год мы прырастаем у аб'ёмах экспарту», — расказаў журналістам генеральны дырэктар ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Гарызонт» Юрый Прадка. Прадстаўляючы прадукцыю прадпрыемства кіраўніку дзяржавы, ён прывёў цікавы факт — першы каляровы тэлевізар, якому ў Савецкім Саюзе прысвоілі Знак якасці, быў выраблены на «Гарызонце». Кіраўнік дзяржавы высока ацаніў якасць выявы на тэлевізары, які сёння прэтэндуе на атрыманне Знака якасці. Таксама Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як ідуць справы з вырабам і рэалізацыяй беларускіх камп'ютараў, якія ў мінулым годзе прадставіў «Гарызонт». Юрый Прадка запэўніў, што гэтая тэхніка ўдасканалена і свабодна прадаецца на рынку.




Адным з першых у савецкія часы Знак якасці атрымаў Мінскі аўтамабільны завод. Першапраходцам стаў грузавы аўтамабіль МАЗ-53352. Сёння на гэта прэтэндуе аўтамабіль-самазвал МАЗ-65262L. Сярод прэтэндэнтаў і камбайны «Гомсельмаша». Прэзідэнт нагадаў пра сваё даручэнне — адрамантаваць усе камбайны, якія сёння ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах «ляжаць пад плотам». Пытанне аб рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, замест таго, каб яе выкідваць і купляць новую, неаднаразова абмяркоўвалася падчас наведвання кіраўніком дзяржавы сельгаспрадпрыемстваў.

ААТ «Камволь» сёння — самае буйное прадпрыемства на постсавецкай прасторы, якое вырабляе тонкія ваўняныя тканіны. Для прысваення Знака якасці прапаноўваецца шэсць артыкулаў тканіны, якія сёння найбольш папулярныя ў спажыўцоў. Сярод іх новы від — тканіна коўдравай групы, з якой шыюць суконныя коўдры. Сёння гэтая тканіна карыстаецца вялікім попытам. Аглядаючы стэнд ААТ «Світанак», Прэзідэнт пацікавіўся, ці задавальняе прадпрыемства патрэбнасць рынку. І адзначыў, што якасць гэтай прадукцыі ацэньвае народ, паколькі прадукцыя вельмі запатрабаваная.

Прэзідэнт таксама даў высокую адзнаку кандытарскай прадукцыі «Камунаркі» і прадукцыі пад маркай «Малочны гасцінец», якая таксама прэтэндуе на Знак якасці.

Падчас агляду экспазіцыі Аляксандр Лукашэнка не проста азнаёміўся з прадукцыяй, а распытаў кіраўнікоў аб сітуацыі на прадпрыемствах, цікавіўся, як вырашаюцца асноўныя праблемы і выконваюцца даручэнні. Вялікую ўвагу ён удзяліў пытанням імпартазамяшчэння, лакалізацыі айчыннай прадукцыі.

## «Трэба заслужыць гэты Знак якасці»

***«Мы павінны пераўзысці сябе. Але каб гэта зрабіць, не павінна быць фармалізму і разгільдзяйства, — задаў тон нарады кіраўнік дзяржавы. — Што для птушачкі правялі, адзначылі, усё добра — гэтага быць не павінна. І не будзе, гэта я вам абяцаю. Настройвайцеся адразу з першых дзён гэтага года на складаную цяжкую працу».***

«Мы вызначылі амбіцыйную мэту: паставіць кантроль якасці тавараў і паслуг, якасці жыцця краіны на больш высокі ўзровень. Яшчэ раз хачу адзначыць: Беларусь можа ганарыцца сваімі якаснымі таварамі. Але, каб быць у трэндзе, каб канкурыраваць з найлепшымі сусветнымі ўзорамі, трэба крыху дадаць. Трэба заслужыць гэты Знак якасці», — падкрэсліў Прэзідэнт. **Па яго словах, у гэтым імкненні беларусам ёсць на што абаперціся.**

**Па-першае — традыцыі.** Аб гэтым таксама ішла размова і на выстаўцы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь захавала пераемнасць савецкай эпохі. «Гэты гістарычны перыяд даў старт нашаму нацыянальнаму развіццю, — сказаў ён. — Цяпер вы разумееце, чаму, як мяне крытыкавалі, я чапляюся за той савецкі час. Калі б не было таго савецкага часу, не было б самых сучасных і новых узораў. Загубіць усё працай. Але на базе чаго мы ствaралі б новыя сучасныя ўзоры? І базы не было б. ***Разумныя людзі захоўваюць усё тое, што назапашана папярэднімі пакаленнямі, і развіваюць гэта. Мы гэта зрабілі».***

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што эканоміка БССР была адной з найбольш тэхналагічных і развітых сярод іншых саюзных рэспублік. «Перажыўшы разруху 90-х, нам няпроста было зберагчы створаныя працай савецкіх людзей стандарты якасці, але ўдалося», — сказаў Прэзідэнт. Ён прызнаўся, што падчас свайго першага наведвання Мінскага трактарнага завода ў статусе Прэзідэнта ў 1994 годзе адчуў, што прарвёмся. «Чаму? Таму што людзі, людзі былі накіраваны на гэта. Людзі ў такі пераплёт трапілі, што дзявацца было няма куды. Выкараскаліся. Сёння ствараем самыя сучасныя ўзоры тэхнікі. Але кажу шчыра: якасці яшчэ не хапае», — падкрэсліў беларускі лідар. Пры гэтым ён звярнуў увагу, што ў спіну айчынным вытворцам дыхаюць канкурэнты, паколькі ўсё, што сёння вырабляецца ў нашай краіне, вырабляецца і ў дзясятках краін свету.

**Па-другое — імідж Беларусі як пераемніцы найлепшых савецкіх дасягненняў.** «Сучасныя выклікі дэманструюць разумнасць і дальнабачнасць выбару народа, які падтрымаў такі курс палітычнага развіцця», — адзначыў Прэзідэнт.

**Па-трэцяе — узрастаючы попыт на каштоўнасці сацыяльнай дзяржавы.** І не толькі на постсавецкай прасторы. Па ўсім свеце. ***«Вяртанне да гэтых каштоўнасцяў — пытанне якасці жыцця людзей: духоўнай сферы, эканамічнага дабрабыту і сацыяльнай справядлівасці. Усё ўзаемазвязана,*** — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму, калі мы кажам якасць і што рабіць, чагосьці тут чакаем. Чакаць нічога не трэба. ***Калі хтосьці не ведае, з чаго пачаць, — пачынайце з сябе. У час прыходзьце на працу і рабіце сваю справу вельмі якасна.*** Тут кожны ведае, як гэта рабіць».

## Павінна быць бачна ў краіне, што ідзе Год якасці

Нарада прайшла ў шырокім складзе. На яе былі запрошаны кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, прэм'ер-міністр і яго намеснікі, старшыні дзвюх палат парламента, міністры, кіраўнікі дзяржаўных органаў і прадпрыемстваў. Па словах Прэзідэнта, гэта было зроблена для таго, каб яго пачулі і зразумелі, што прахадных мерапрыемстваў для птушачкі ў гэтым годзе не будзе. І не толькі ў гэтым годзе. ***«Мы прыйшлі да той сітуацыі, калі трэба падымацца на прыступку вышэй, а можа быць, і на дзве прыступкі. Па-першае, на нас цісну́ць з усіх бакоў, лягчэй не будзе, гэта аб'ектыўна. А па-другое, нельга спыняцца. Калі спынімся, пачнецца загніванне, як гэта ў гісторыі нашай дзяржавы часта бывала. І не толькі нашай дзяржавы. Таму ніякіх мерапрыемстваў для таго, каб паказацца. Паказухі не павінна быць»***, — сказаў Прэзідэнт.

Урадам падрыхтаваны рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні Года якасці. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў яшчэ раз: там не павінна быць нейкіх фармальных мерапрыемстваў, якія не прывядуць да канкрэтных вынікаў. Таксама Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што план павінен адлюстраваць асноўную ідэю Года. Яна мае цэлы спектр кірункаў — ад беражлівага стаўлення да рэсурсаў да асабістай адказнасці за вынікі сваёй працы.

Яшчэ адно пытанне, вынесенае на парадак дня, — заснаванне Дзяржаўнага знака якасці. Тут таксама ёсць досвед і традыцыі СССР, якія стануць фундаментам для заснавання Знака якасці суверэннай Беларусі. Удзельнікі нарады абмеркавалі варыянты выявы, канцэпцыю прысваення знака і парадак пацвярджэння адпаведнасці яму з боку вытворцаў тавараў і паслуг.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Год якасці не павінен прайсці фармальна, каб ніхто не заўважыў. «Людзі павінны бачыць, што гэта Год якасці. І гэта наша патрабаванне найжорсткае да якасці жыцця людзей, да саміх сябе. Гэта комплекс мерапрыемстваў. І павінна быць бачна ў краіне, што ідзе Год якасці і што ён скончыцца — вось яго вынікі», — рэзюмаваў ён.

## Канкурэнтаздольная эканоміка і высокі ўзровень жыцця

Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка расказаў, як урад бачыць гэты год. Ён адзначыў, што пытанні якасці як прыярытэт дзяржаўнай палітыкі нашай краіны пастаянна знаходзяцца ў фокусе ўвагі ўрада. Адзіная прэмія ўрада, якая існуе ў краіне, уручаецца за дасягенні ў галіне якасці. Але, як падкрэсліў Раман Галоўчанка, прыйшоў час узняць гэтае пытанне на больш высокі ўзровень. Ён адзначыў, што работа па павышэнні якасці вядзецца ў краіне не першы год і сёлета яна не пачынаецца з нуля. «Галоўны крытэрый — гэта ўзрастаючы экспарт беларускіх тавараў і паслуг і пазнавальнасць нашага нацыянальнага брэнда «Зроблена ў Беларусі», які прадстаўлены ў 160 краінах свету. Згодна са статыстыкай, мінулы год адзначаны ростам беларускага экспарту — за 11 месяцаў ён дасягнуў 36 мільярдаў долараў і перавысіў паказчыкі 2022 года амаль на 6 %. Расце і геаграфія паставак», — расказаў Раман Галоўчанка.

Прэм'ер-міністр заўважыў, што пазнавальнасць Беларусі не толькі ў яе экспарце, але і ў колькасці людзей, якія яе наведваюць. Толькі ў мінулым годзе нашу краіну наведала звыш 1,6 мільёна чалавек са 173 краін. Замежныя грамадзяне цікавяцца культурнымі і турыстычнымі славутасцямі, да нас едуць лячыцца — у мінулым годзе пралечана 123 тысячы грамадзян са 149 краін свету. У Беларусі вучыцца 25 тысяч студэнтаў больш чым са 100 краін свету. «Не было б якасці адукацыі і лячэння, ніхто б сюды не ехаў. Нават нягледзячы на бязвізавы рэжым. Але расці ёсць куды», — падкрэсліў Раман Галоўчанка. Па яго словах, сёння прыярытэт — гэта мадэрнізацыя прадпрыемстваў, стварэнне імпартазамяшчальных інавацыйных вытворчасцяў у рамках выканання намечаных планаў і праграм.

Раман Галоўчанка зрабіў акцэнт на тым, што дэвіз 2024 года — «Якасць ва ўсім — залог росквіту Беларусі». Ён прадставіў падрыхтаваны ўрадам рэспубліканскі план па правядзенні ў 2024-м Года якасці. Дакумент уключае 124 мерапрыемствы.

Кіраўнік урада вылучыў два асноўныя кірункі гэтых мерапрыемстваў. Першы — мерапрыемствы, якія забяспечваюць канкурэнтаздольнасць нацыянальнай эканомікі на сусветным рынку. Другі кірунак — мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне якасці жыцця беларускага народа. Асобную ўвагу Раман Галоўчанка звярнуў, што ў плане ўдзелена асаблівая ўвага такой сферы, як павелічэнне колькасці прадуктаў для здаровага харчавання і прадуктаў арганічнай сельгасвытворчасці. Трэці кірунак плана — гэта энергаэфектыўнасць і ўстойлівая энергетыка. Чацвёрты — беражлівае і прадуманае стаўленне да рэсурсаў. Пяты — эфектыўнасць кантролю за якасцю. Тут у цэнтры ўвагі — кадры і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы кантролю якасці (вымяральнае абсталяванне, інструменты, стандарты і гэтак далей). Шосты кірунак плана — укараненне інавацый і рацыяналізатарскіх ідэй.

Раман Галоўчанка заўважыў, што ў Год якасці неабходна абудзіць у людзях разуменне таго, што якасць — гэта тое, чым кожны займаецца на працы і ў сям'і. «Мы прапануем праводзіць мерапрыемствы, якія будуць накіраваны на асвету грамадзян і фарміраванне ў іх асабістай адказнасці за якасць свайго жыцця», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Па яго словах, дзяржава прыняла дастатковыя меры для таго, каб павысіць якасць жыцця грамадзян. У 2024 годзе вырасце зарплата ў бюджэтнікаў, павялічацца выплаты асобным катэгорыям працаўнікоў, падымуцца пенсіі, у сістэме адукацыі будзе працягнута работа па засваенні прафнавучання ў сістэме вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, будуць уведзены новыя спецыяльнасці для эканомікі. Шэраг праектаў рэалізуюць для ўдасканалення якасці і павышэння даступнасці медыцынскіх паслуг, самыя вялікія з іх — «Клапатлівая паліклініка» і «Здаровыя гарады і пасёлкі». Запланавана правядзенне 152 рэспубліканскіх спартыўна-масавых мерапрыемстваў і больш чым 15 тысяч такіх мерапрыемстваў на ўзроўні абласцей і раёнаў. Найважнейшай падзеяй 2024 года Раман Галоўчанка назваў святкаванне 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

## Дабрабыт усёй краіны залежыць ад якасці працы кожнага

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка засяродзіўся на кадравых, ідэалагічных і інфармацыйных аспектах правядзення Года якасці. Ён звярнуў увагу, што дасягненне эканамічных вынікаў забяспечваюць кваліфікаваныя спецыялісты ад рабочага на прадпрыемстве да міністра.

Сёння ў краіне выбудавана дакладная структура работы з кадрамі. «Высокая якасць жыцця чалавека дасягаецца вырашэннем яго сацыяльных праблем. Прадугледжаны шэраг мерапрыемстваў па павышэнні якасці медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, узроўню адукацыі, стварэнні ўмоў для самарэалізацыі моладзі, удасканаленні камфортнага асяроддзя пражывання», — расказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Ён падкрэсліў, што сацыяльная сфера — гэта ў першую чаргу работа з людзьмі, і паводле яе вынікаў насельніцтва ацэньвае эфектыўнасць улады.

### ❍ У тэму

## Беларускі прадукт азначае якасны прадукт

Пасля нарады ў размове з журналістамі **прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Раман ГАЛОЎЧАНКА** падкрэсліў, што якасць — найважнейшае паняцце, якое вызначае як стаўленне спажыўца да таго ці іншага тавара, так і паспяховасць работы прадпрыемства ў цэлым. «Мы ніколі не спынялі барацьбу за якасць. Цяпер Прэзідэнт даручыў паглядзець на гэта пад іншым ракурсам. Якасць, спажывецкія якасці прадукцыі, надзейнасць, доўгавечнасць і гэтак далей — гэта, безумоўна, заўсёды было, ёсць і будзе. Але якасць павінна расці з нашага стаўлення да яе», — заўважыў ён.

Раман Галоўчанка звярнуў увагу, што нездарма за мяжой «беларускі прадукт» азначае «якасны прадукт». Гэта нарадзілася не на пустым месцы. Гэтаму папярэднічала доўгая мэтанакіраваная работа па падтрыманні стандартаў якасці, асабліва ў харчовай прадукцыі. Аднак прэм'ер-міністр падкрэсліў, што гэта зусім не нагода для самазаспакоенасці. «Мы павінны яшчэ раз заклікаць людзей задумацца аб тым, што кожны на сваім месцы павінен працаваць якасна, кім бы ён ні працаваў», — сказаў Раман Галоўчанка.

Што датычыцца выгляду Знака якасці, то, як паведаміў Раман Галоўчанка, канчатковае рашэнне яшчэ не прынята. Гэтае пытанне вырашыцца ў найбліжэйшы час з улікам выказаных заўваг.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што за ўзнагароду вытворцам трэба будзе пазмагацца. Атрымаць Знак якасці будзе цяжка, але вельмі прэстыжна. Прыняць удзел у спаборніцтвах на якасць могуць як маладыя прадпрыемствы, так і вытворцы з багатай гісторыяй.

«Знак якасці будзе прысуджацца не прадпрыемству ў цэлым і нават не групе тавараў, а канкрэтнаму вырабу канкрэтнага вытворцы — аўтамабілю, тканіне і гэтак далей. Таму і працэдура прыняцця рашэння павінна быць вельмі дакладнай», — дадаў Раман Галоўчанка. Плануецца, што рашэнне будзе прымаць рэспубліканская атэстацыйная камісія. Падрабязней усю працэдуру прапішуць у пастанове ўрада. Алгарытмы будуць падобныя да тых, што былі пры прысуджэнні Знака якасці савецкага часу.

Мяркуецца, што першыя ўладальнікі Знака якасці з'явяцца ў Беларусі напрыканцы гэтага года.

На першым месцы ў ідэалагічнай частцы плана — інфармаванне насельніцтва, тлумачэнне мэт, задач і стратэгій Года якасці. «У літаральным сэнсе гэтага слова трэба захапіць гэтай ідэяй усё беларускае грамадства і дзяржаўныя інстуты. Задача ідэалагічнай вертыкалі — не пераконваць людзей заклікамі і лозунгамі, а паказваць яркія прыклады самаахвярнай працы, ствараць інфармацыйны фон, які дазволіць чалавеку зрабіць правільныя высновы», — сказаў Ігар Сергеенка. Па яго словах, у ідэале кожны грамадзянін павінен разумець, што дабрабыт краіны, ад якога залежыць асабістая задаволенасць якасцю жыцця, у першую чаргу, забяспечваецца якасцю яго ўласнай працы.

Ігар Сергеенка заўважыў, што пытаннямі якасці беларускай прадукцыі ці якасцю паслуг таксама павінны заняцца і грамадскія арганізацыі ў адпаведнасці са сваёй спецыфікай.

Асобную ўвагу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў на Знак якасці Рэспублікі Беларусь. «Новы Знак якасці будзе атрымліваць, вядома ж, самая лепшая прадукцыя. Аднак гэта не азначае, што і астатняя прадукцыя, паслугі стануць горшымі або будуць няякаснымі. Наадварот, гэта стымул і матывацыя да таго, каб дасягнуць больш высокай планкі ў ацэнцы, знайсці эфектыўныя рашэнні і прыёмы ў рабоце, каб атрымаць найлепшы вынік. Мы гаворым аб руху ўверх, стварэнні новага механізму для яшчэ больш моцнай канкурэнцыі і матывацыі», — сказаў Ігар Сергеенка. Пры гэтым ён падкрэсліў, што ўсе запланаваныя на Год якасці мерапрыемствы павінны праводзіцца ў доўгатэрміновай перспектыве, не абмяжоўвацца каляндарным годам. «Усё, што плануецца арганізаваць у Год якасці, не завершыцца з яго заканчэннем, а стане нашым укладам, мы будзем да гэтага імкнуцца», — запэўніў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

## Стабільная якасць прадукцыі — галоўны крытэрый

Падчас нарады выступіў старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Валянцін Татарыцкі. Ён расказаў, што падрыхтаваны праект прэзідэнцкага ўказа аб Дзяржаўным знаку якасці. Дакументам засноўваецца сам знак, палажэнне аб ім і яго апісанне. Пры распрацоўцы Дзяржаўнага знака Рэспублікі Беларусь быў узяты за аснову Знак якасці, які прысвойваўся ў часы Савецкага Саюза. Валянцін Татарыцкі расказаў, што Знак якасці можа прысвойвацца харчовым таварам, таварам народнага спажывання і прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння. «Крытэрыямі прысуджэння Знака якасці з'яўляецца якасць прадукцыі, што супастаўляюцца з паказчыкамі найлепшых айчынных і замежных і прамысловых узораў. І самае галоўнае — гэта стабільная якасць вытворчасці, якая дасягаецца пры спалучэнні ключавых паказчыкаў: бяспекі, экалагічнасці, інавацыйнасці, тэхналагічнасці і эстэтычнасці. Па гэтых паказчыках і будзе ацэньвацца прадукцыя, якая будзе прэтэндаваць на прысуджэнне Знака якасці», — растлумачыў Валянцін Татарыцкі.

Актуальнае пытанне — як будзе выглядаць Знак якасці Рэспублікі Беларусь? Старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі расказаў, што было падрыхтавана больш за 20 варыянтаў, у своеасаблівы «фінал» пасля ўсіх абмеркаванняў і ўзгадненняў выйшлі пяць варыянтаў. Усе яны выкананы па тыпе савецкага знака якасці — у форме пяцівугольніка, які сімвалізуе якасць беларускай прадукцыі, што дасягаецца спалучэннем паказчыкаў вытворчасці. Адрозніваюцца толькі дэталі. На адным у цэнтры фігуры намалявана перавернутая на 90 градусаў літара К (як гэта было ў савецкі час). Гэты знак складаецца з двух стэлавідных элементаў, ніжні абазначае ўстойлівасць сістэмы і стабільнасць якасці прадукцыі, верхні як сімвалічныя вагі — аптымальнае стаўленне грамадскага меркавання да прадукцыі і дасягненні вытворчасці. Ёсць варыянты, дзе ў цэнтры фігуры — бусел.

«Мне здаецца — у тым савецкім знаку прычапіцца няма да чаго. Там усё мінімальна. Штучна не трэба адыходзіць ад добрага, я лічу. Празмернасцяў не павінна быць. Ні колеравая гама, ні малюнкі не павінны перагружаць сам знак», — выказаў сваё меркаванне Аляксандр Лукашэнка.

Падводзячы вынікі нарады, Прэзідэнт падкрэсліў, што адчуць Год якасці павінен кожны беларус праз змяненне якасці свайго жыцця. А гэта адказнасць не толькі дзяржавы, але і кожнага чалавека.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «Ісус, схіліўшы нябёсы, сышоў...»



*Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя сыны і дочкі Беларускай Праваслаўнай Царквы!*

Сёння нашы сэрцы напаўняюцца радасцю аб народжаным Спасіцелі свету, разам з ангеламі мы праслаўляем Бога, спяшаемся з пастухамі да Віфлеемскай пячоры, ідзём услед за мудрацамі, каб прынесці Богадзіцяці свае дары.

Нашы духоўныя вочы звернуты сёння да ясляў, у якіх ляжыць Агнец Божы, паколькі «ўсе Божыя скарбы і багацці незлічоныя, неацэнныя, якія нікуды не могуць умясціцца, усе яны ўкладзены ў цесныя яслі, усе змешчаны і пакрыты жменяй сена» (свц. Дзімітрый Растоўскі)!

У гэты дзень здзейснілася «вялікая набожнасці тайна: Бог явіў Сябе ў плоці» (1 Цім. 3, 16). Разбурана перашкода, якая пасля грэхападзення ўзнікла паміж Богам і чалавекам, паміж небам і зямлёю, бо ў Хрысце Ісусе, паводле слова свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага, «Бог зрабіўся Чалавекам, а чалавек — Богам, неба становіцца зямлёю, а зямля — небам».

Богаўцялесненне адкрывае нам ісціну, небывалую раней, якую не мог умясціць чалавечы розум. «Бо так узлюбіў Бог свет, што Сына Свайго Адзінароднага даў, каб кожны, хто веруе ў Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае» (Ін. 3, 16). І гэтая невымоўная любоў выяўляецца не толькі ў пакутах на Крыжы і смерці Спасіцеля, не толькі ў Яго дабрадзействах і ацаленнях, — само Яго прышэсце ў гэты свет сведчыць пра бязмежную любоў Бога да чалавека.

І мы ў гэты дзень з глыбокай пашанай і сардэчным трымценнем успрымаем словы святочнага богаслужэння, якія раскрываюць нам сэнс прыняцця Сынам Божым чалавечай прыроды: «Убачыўшы створанае па вобразе і падабенстве, але пашкоджанае парушэннем запаведзі, Ісус, схіліўшы нябёсы, сышоў і ўсяліўся ў дзявочае ўлонне, не змяніўшыся, каб у ім абнавіць пашкоджанага Адама...» (Мінея. Раждцаство Хрыстова. Вялікае павячэр'е. Сціхіра на ліціі).

Чалавек з гэтага часу ўжо не асуджаны на знаходжанне ў цемры і цяні смяротным, «бо перашкода, якая раздзяляла, — разбурана, палымяны меч адхілены, і Херувім адыходзіць ад дрэва жыцця, і я спажываю райскую ежу, ад якой быў адагнаны з-за непаслухмянасці» (Мінея. Раждцаство Хрыстова. Вялікая вячэрня. Вершы на «Господи, воззвах»).

Святыя айцы ўказваюць на важны вынік Богаўцялеснення: абноўлены чалавек не проста вяртаецца да спрадвечнага дабра, якім валодаў Адам, але атрымлівае непараўнальна больш, бо праз Ісуса Хрыста ён уваходзіць у яднанне з Богам, яшчэ больш глыбокае, чым да грэхападзення.

Паводле слова апостала Паўла, «Царства Божае... радасць у Духу Святым» (Рым. 14, 17). Менавіта прышэсце ў свет Цара і Госпада з'яўляецца асновай няспыннай духоўнай радасці, якая была недаступнай для старазапаветнага чалавека. Але як жа нам неабходна жыць, каб увайсці «ў радасць Госпада свайго», каб Раждцаство Хрыстова было не проста адным з многіх святаў, а асвятляла сваім ззяннем усе імгненні нашага жыцця?

На гэтае пытанне адказвае Сам Гасподзь наш Ісус Хрыстос: «Узлюбі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёй душою тваёю, і ўсім разуменнем тваім, і ўсёй сілаю тваёю, — гэта першая запаведзь. І другая падобная да яе: узлюбі бліжняга твайго як самога сябе» (Мк. 12, 30-31).

Менавіта выкананне евангельскіх запаведзяў — залог нашага следавання за Хрыстом і яднання з Ім. Чалавечае жыццё напоўнена выпрабаваннямі і цяжкасцямі; на нашай зямлі па-ранейшаму шмат супярэчнасцяў і разладаў, але ад нас, хрысціян, залежыць — ці напоўнім мы гэты свет Хрыстовым святлом і радасцю, ці станем мы духоўнай закваскай, якая пераменіць у добры бок тое асяроддзе, у якім кожны з нас жыве і працуе.

Кожны дзень нашага жыцця дае нам магчымасць папрацаваць для Бога і бліжняга. І калі мы будзем глядзець на свой жыццёвы шлях у евангельскай перспектыве, то ўсё ў ім будзе напоўнена сэнсам і асвячона Божым благаславеннем.

Спасціжэнне асабістага сапраўднага сэнсу жыцця, гарманічнасць грамадскіх адносін — усё гэта дасягаецца праз выкананне Божых законаў. Але многія людзі не ведаюць ці проста забываюць пра іх існаванне. І нашае сапраўднае хрысціянскае жыццё, а таксама шчырая любоў да бліжняга будуць жывым напамінам і пацверджаннем добрасці і мудрасці тых запаведзяў, пра якія дабравесціў нам Гасподзь Ісус Хрыстос.

Дарагія браты і сёстры, сардэчна віншую вас з Раждцаством Хрыстовым і Навалеццем! У гэтыя святыя дні жадаю, каб светлая радасць аб народжаным Богадзіцяці стала крыніцай нашага духоўнага абнаўлення, каб кожнае імгненне нашага жыцця было адказам падзякі на любоў Божую да нас. Будзем жа прытрымлівацца евангельскіх запаведзяў, бо менавіта ў іх выкананні — залог не толькі асабістага спасення, але і добрага грамадскага парадку.

Няхай само нашае жыццё сведчыць пра веру ў Госпада Ісуса Хрыста, Які дзеля вялікай любові да людзей нарадзіўся ў Віфлееме і дагэтуль нараджаецца ў сэрцы кожнага веруючага чалавека. Няхай Гасподзь падасць шчодрыя благадатныя дары ўсёй нашай Айчыне, працоўным калектывам, сем'ям і няхай благаславіць нашы добрыя пачынанні ў новым годзе.

**Веніямін, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**

**За гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці фашысты знішчылі больш за 11 900 савецкіх грамадзян, на франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі каля 7000 нашых землякоў. На тэрыторыі раёна пахаваны каля 19 000 воінаў і партызан, спалены 183 вёскі, з іх 35 не адрадзіліся. Вырашальнай на шляху да вызвалення стала Гарадоцкая наступальная аперацыя.**

# СЦЯГ ПЕРАМОГІ



## ПАДРЫХТОЎКА

Для генерала Івана Хрыстафоравіча Баграмяна Гарадоцкая аперацыя была першай, у якой ён удзельнічаў у рангу камандуючага войскамі фронту, што і вызначыла тое імкненне да актыўных наступальных дзеянняў, якое выяўлялася ў яго рашэннях і патрабаваннях да падначаленых. Падрыхтоўка да наступу пачалася 19 лістапада пры неспрыяльных умовах надвор'я: пачалася адліга, раставаў снег, шчыльная воблачнасць закрыла неба. Дарогі сталі непраходнымі для колавага аўтатранспарту, а месцамі і для гусенічнага. Усё складвалася так, што паспешлівы пачатак удару пры такім неспрыяльным надвор'і мог пагібельна паўплываць на ход і зыход аперацыі. Таму, прадумаўшы самыя пераканаўчыя аргументы, генерал арміі Іван Баграмян звярнуўся ў стаўку з просьбай аб адтэрміноўцы аперацыі. Іосіф Сталін паставіўся да яе з разуменнем і дазволіў перанесці наступ на больш позні тэрмін. Перадышка была выкарыстана для больш грунтоўнай падрыхтоўкі войскаў.

Вызваленне Гарадоцкага раёна пачалося ў кастрычніку 1943 года, калі завяршылася Невельская аперацыя. З узяцця Невеля на стыку германскіх армій «Поўнач» і «Цэнтр» перастала дзейнічаць ракадная чыгуначная дарога Дно — Навасакольнікі — Невель. Германскае камандаванне пазбавілася магчымасці манеўрываць сваімі сіламі. Калінінскаму (з 20 кастрычніка 1-му Прыбалтыйскаму) фронту адкрываўся шлях для далейшага наступу на Віцебск і Полацк.

Праціўнік імкнуўся стрымаць наступальны парыў нашых армій, перакінуўшы пад Гарадок, які знаходзіўся паміж Невелем і Віцебскам, дадатковыя сілы: дзве пяхотныя дывізіі з-пад Ленінграда, пяць пяхотных і адну танкавую дывізіі з паўднёвага крыла групы армій «Цэнтр». Авіяцыйная групіроўка ворага таксама ўзмацнілася. У выніку зацятых баёў у канцы кастрычніка Чырвоная Армія вызваліла першыя населеныя пункты Марчанскага, Руднянскага, Газьбінскага сельсаветаў.

У сярэдзіне лістапада 4-я і 3-я ўдарныя арміі 1-га і 2-га Прыбалтыйскіх франтоў прарвалі варожую абарону на захад ад Невеля і прасунуліся на поўдзень і паўночны захад. Праціўнік, выкарыстоўваючы рэзервы, аказаў упартае супраціўленне. Наступ нашых армій быў спынены. Яны апынуліся ў своеасаблівым «мяшку», які быў выцягнуты на 100 км з поўначы на поўдзень і на 55 км з усходу на захад. Сувязь з асноўнымі сіламі франтоў падтрымлівалася праз пярэсмык шырынёй 10-11 кіламетраў. У лініі фронту ўтварыўся вялікі выступ, у аснове якога знаходзіўся Гарадок.

Разгортваючы наступ з яго вяршыні, нямецкія войскі маглі перарэзаць участак, які злучаў дзве нашы арміі з галоўнымі сіламі, цалкам акружыць іх і ліквідаваць, такім чынам засцерагчыся на Віцебскім і Полацкім напрамках. Варожы бок рыхтаваўся да такога наступу, пра што сведчылі даныя франтавой разведкі.

Каб не дапусціць акружэння сваіх войскаў, камандаванне 1-га Прыбалтыйскага фронту на чале з генералам арміі Іванам Баграмянам распрацавала план наступальнай аперацыі. Галоўная роля ў яе ажыццяўленні адводзілася войскам 11-й гвардзейскай арміі (камандзір генерал-лейтэнант Кузьма Галіцкі) і 4-й ударнай (камандзір генерал-лейтэнант Васіль Швяцоў). Планаваўся сустрэчны наступ гэтых армій на станцыю Бычыха з мэтай акружэння і разгрому сіл праціўніка ў раёне азёр Ардова, Езярышча і ліквідацыі Гарадоцкага выступу.

**Вызваленне Гарадоцкага раёна пачалося ў кастрычніку 1943 года, калі завяршылася Невельская аперацыя. З узяцця Невеля на стыку германскіх армій «Поўнач» і «Цэнтр» перастала дзейнічаць ракадная чыгуначная дарога Дно — Навасакольнікі — Невель. Германскае камандаванне пазбавілася магчымасці манеўрываць сваімі сіламі.**



Войскі 11-й гвардзейскай арміі наносілі галоўны ўдар у цэнтры варожых пазіцый і два дапаможных на флангах з мэтай звязаць баявымі дзеяннямі праціўніка на ўсім участку наступу і пазбавіць яго магчымасці манеўрываць сваімі сіламі. 4-й ударнай арміі даводзілася наступаць на станцыю Бычыха з захаду, з «мяшка».

Да ўдзелу ў аперацыі з савецкага боку прыцягваліся войскі шасці стралковых, двух танкавых і аднаго кавалерыйскага карпусоў, дзве танкавыя брыгады, асобныя артылерыйскія, мінамётныя, інжынерныя падраздзяленні. Дзеянні наземных войскаў падтрымліваліся авіяцыяй 3-й паветранай арміі. Агульныя суадносіны сіл бакоў былі на карысць Чырвонай Арміі.

Гітлераўцы добра ўмацавалі свае пазіцыі. Іх абарончы рубеж узводзіўся тут летам і восенню 1943 года і атрымаў назву «Пазіцыя Пантэра». У паласе наступлення 11-й гвардзейскай арміі абарона праціўніка складалася з некалькіх ліній траншэй, бліндажоў у 3-5 накатаў. Танкі і бронемашыны, падбітыя ў папярэдніх баях, былі закапаныя ў зямлю і з'яўляліся браніраванымі кулямётна-артылерыйскімі пунктамі. Фашысты стварылі сістэму апорных пунктаў на пануючых вышынях, у вёсках, уздоўж чыгункі і шашы. Пярэдні край абарончых умацаванняў меў мінныя палі, калючы дрот. Увесь раён абароны прастрэльваўся з розных напрамкаў. Вораг добра выкарыстаў асаблівасці мясцовасці са шматлікімі рэкамі, балотамі, якія не прамярзалі да канца снежня. Гэтыя абставіны стваралі значныя цяжкасці для перамяшчэння баявой тэхнікі, а многія месцы былі зусім недаступнымі для яе руху. Гітлераўцы разлічвалі тут зімаваць. Усе бліндажы былі забяспечаны печкамі, а афіцэрскія нават мелі мэблю, канфіскаваную ў мясцовых жыхароў.

Нашы войскі настойліва рыхтаваліся да наступу, прызначанага на 26 лістапада. Асаблівая ўвага надавалася забеспячэнню воінскіх фарміраванняў боепрыпасамі. На баявыя пазіцыі, куды нельга было пад'ехаць з-за бездарожжа або недахопу транспартных сродкаў, артылерысты і пехацінцы самі неслі снарады і міны. З гэтай мэтай штодня кожнай дывізіі 11-й гвардзейскай арміі выдзяляліся спецыяльныя групы з найбольш фізічна моцных байцоў. Наступальным дзеянням не спрыяла надвор'е. Дажджы і туманы не давалі магчымасці дзейнічаць авіяцыі. З дазволу стаўкі наступ быў перанесены на больш позні тэрмін да ўстанаўлення добрага зімовага надвор'я, калі можна было б ужываць і авіяцыю, і танкі.

## АДПРАЎНЫ СНЕЖАНЬСКІ ПУНКТ

13 снежня пачалося наступленне армій 1-га Прыбалтыйскага фронту. Двухгадзінная артылерыйская падрыхтоўка змянілася атакай байцоў 11-й гвардзейскай арміі пры падтрымцы танкаў. Атакуючыя ўварваліся ў траншэі першай лініі абароны праціўніка, аднак далей рухацца не змаглі. Моцны агонь праціўніка спыніў нашы танкі, залягла пяхота. Артылерыйскія і мінамётныя батарэі гітлераўцаў, якія захаваліся пасля артылерыйскага налёту на другім абарончым рубяжы, затрымалі падраздзяленні, што наступалі. Прыйшлося зноў пачаць артылерыйскі абстрэл, паўтарыць атаку. На гэта было патрачана шмат часу. Вораг змог падцягнуць рэзервы, актыўна супраціўляючыся.

Аперацыя развівалася не так, як планавалася. Большасць наступаючых часцей 11-й гвардзейскай арміі да канца дня пераадолелі нязначную адлегласць. Найбольшага поспеху дамаглася 84-я гвардзейская стралковая дывізія: яе байцы прайшлі наперад на два кіламетры ў паласе шырынёй 1,5 км.

Наступ 4-й ударнай арміі ў першы дзень быў больш паспяховым. На ўчастку прарыву пасля артпадрыхтоўкі была пастаўлена дымавая заслона, пад покрывам якой пачалі атаку танкі і пяхота 2-га гвардзейскага стралковага корпуса. 47-я стралковая дывізія разам з 24-й танкавай брыгадай прарвалі галоўную паласу абароны праціўніка і на працягу дня прасунуліся на 5 кіламетраў наперад. Добрае ўзаемадзеянне пяхоты, танкаў і артылерыі забяспечылі поспех. На тры кіламетры ўкліняліся ў варожую абарону гвардзейцы 90-й стралковай дывізіі, якая наступала ў цэнтры, і наблізіліся да другой абарончай мяжы гітлераўцаў. Поспеху 4-й ударнай арміі спрыяла раптоўнасць наступу, пры-



# НАД ГАРАДКОМ

мяненне дыму, што было нечаканым для ворага.

На наступны дзень у баявыя дзеянні 11-й гвардзейскай арміі былі ўнесены карэктывы. Генерал-лейтэнант Кузьма Галіцкі вырашыў перанесці галоўны ўдар з цэнтральнага ўчастка на правы фланг, у паласу 84-й гвардзейскай стралковай дывізіі і падмножыць яе поспех, дасягнуты напярэдадні.

Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі 84-я гвардзейская стралковая дывізія пры ўзаемадзеянні з 159-й танкавай брыгадай, якой камандаваў палкоўнік Сямён Хайдукоў, перайшла ў наступ. У хуткім часе ўступілі ў бой 117-я танкавая і 44-я мотастралковыя брыгады 1-га танкавага корпуса. Для падтрымкі танкавых брыгад стваралiся спецыяльныя артылерыйскія групы, прадстаўнікі якіх карэктавалі агонь, знаходзячыся ў камандзірскіх танках. Такое цеснае ўзаемадзеянне танкаў з пяхотай і артылерыяй забяспечыла поспех: у першай палове дня гэтыя ваенныя фарміраванні дасягнулі шашу Невель — Гарадок. Прарвала абарону ворага таксама 16-я гвардзейская стралковая дывізія.

Камандуючы 4-й ударнай арміяй генерал Васіль Швяцоў 14 снежня таксама ўвёў у бой дадатковыя сілы: 41-ю танкавую брыгаду і дзве кавалерыйскія дывізіі. Адна з іх, 5-я гвардзейская кавалерыйская дывізія, перарэзала чыгунку Невель — Гарадок у раёне раз'езда Расл‌які. Лявей вяла баі за чыгунку і 47-я стралковая дывізія. Пяхотны полк праціўніка быў акружаны ў вёсцы Віроўля часткай сіл 90-й гвардзейскай стралковай дывізіі і 70-й танкавай брыгады, якія дзейнічалі сумесна з часткамі 381-й стралковай дывізіі.

Паляпшэнне надвор'я ў гэты дзень дало магчымасць дзейнічаць нашай авіяцыі. Штурмавыя дывізіі 3-й паветранай арміі наносілі ўдары па рэзервах праціўніка, яго агнявых пазіцыях. Актывізавалася і варожая авіяцыя, успыхнулі паветраныя баі. На трэці дзень наступу, 15 снежня, на кірунку дзеяння 4-й ударнай арміі ўступіла ў бой 166-я стралковая дывізія. Яе байцы разам з танкістамі 41-й танкавай брыгады выйшлі да чыгункі на ўсход ад вёскі Малашэнкі.

Працягвалі наступальныя дзеянні войскі 11-й гвардзейскай арміі. Паспяхова дзейнічала 83-я гвардзейская стралковая дывізія, байцы якой авалодалі вёскай Раіны і вялі бой за Сурміна. Адзін з батальёнаў 248-га гвардзейскага стралковага палка гэтай дывізіі вызваліў вёску Кайкі, у якой размяшчаўся артылерыйскі полк праціўніка, і захапіў гарматы. 250-ы гвардзейскі стралковы полк заняў вёску Лапцёўка, дзе знаходзілася пераправа праз раку Обаль і праходзіла адзіная дарога на поўдзень. Узнікла пагроза акружэння нямецкай 211-й пяхотнай дывізіяй. Гітлераўцы распачалі моцныя контратакі, імкнучыся адбіць у савецкага палка гэты населены пункт.

Кузьма Галіцкі пісаў у сваіх успамінах: «Генерал Вараб'ёў ... узмацніў 250-ы гвардзейскі стралковы полк падраздзяленнямі 252-га. Іх сумеснымі намаганнямі менш чым за 12 гадзін былі адбіты пяць шалёных контратак гітлераўцаў, якія імкнуліся прабіцца ўжо не толькі з поўначы, але і з захаду. Лапцёўка і пераправа засталіся ў нашых руках. Праціўнік жа, страціўшы ў ходзе сваіх контратак толькі забітымі больш за 400 салдат і афіцэраў, быў вымушаны дробнымі групамі прабівацца на поўдзень... па забалочанай нізіне, кінуўшы ўсю баявую тэхніку і абозы».

Тры стралковыя дывізіі, 83-я гвардзейская, 156-я і 29-я, завяршылі акружэнне часцей 211-й пяхотнай дывізіі ворага. У гэты ж дзень, 15 снежня, дамаглася поспеху 360-я стралковая дывізія, байцы якой вызвалілі ад немцаў чыгуначную станцыю Езярышча.

Раніцай 16 снежня працягваўся наступ 11-й гвардзейскай і 4-й ударнай армій. У хуткім часе танкісты 1-га і 5-га танкавых карпусоў сумесна з перадавымі падраздзяленнямі 1-й і 90-й гвардзейскіх стралковых дывізій злучыліся ў раёне станцыі Бычыха. У акружэнні апынуліся часткі адной авіяпалявой, чатырох пяхотных дывізій і шасці асобных спецыяльных і ахоўных батальёнаў праціўніка. Нашы войскі пачалі разгром акружанай групіроўкі ворага. Адначасова з розных напрамкаў удар па ёй наносілі 1-я, 31-я, 5-я, 83-я, 90-я, 26-я гвардзейскія і 381-я стралковая дывізіі. За два дні савецкія воіны выканалі задачу па ліквідацыі варожых часцей, якія трапілі ў акружэнне.

За пяць дзён баявых дзеянняў войскі 11-й гвардзейскай і 4-й ударнай армій акружылі і знішчылі варожую групіроўку ў паўночна-заходняй частцы Гарадоцкага выступу. Гэта прывяло да пашырэння (30 — 35 км) гарлавіны прарыву на поўдзень ад Невеля, што значна палепшыла становішча 3-й і 4-й ударных армій.

Адначасова з ліквідацыяй акружаных часцей праціўніка нашы войскі вялі наступ на Гарадок, вызваленне якога 24 снежня сіламі 11-й гвардзейскай арміі стала другім этапам наступальнай аперацыі. У наступныя дні злучэнні гэтай арміі з баямі вылучаліся ў напрамку Віцебска. Лінія фронту адступіла на поўдзень на 18—20 кіламетраў ад мястэчка. Войскі 4-й ударнай арміі наступалі ў напрамку Шуміліна. Яны перарэзалі шашэйныя і чыгуначную дарогі Віцебск — Полацк. Праціўнік аказваў моцнае супраціўленне на ўсіх участках наступлення нашых армій.

У апошнія дні снежня 1943 года Гарадоцкая аперацыя скончылася, быў ліквідаваны выступ у лініі фронту і вызвалена тэрыторыя раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У выніку разлютаваных баёў, асноўныя манеўры якіх праходзілі на подступах да горада, было вызвалена больш за 1200 населеных пунктаў.



## АДВАЯВАНЫ ТАНК У ГОНАР ВЫЗВАЛІЦЕЛЯЎ

Абарончы рубеж немцаў «Пантэра» вакол райцэнтра ў першыя дні наступальнай аперацыі ператварыўся ў магутную і складаную сістэму, але наш адказ быў няўхільны. Савецкія пяхота і танкі імгненна захапілі стратэгічна важныя пункты на першай лініі абароны. Прасоўванне наперад сустрэла супраціўленне, вораг падцягнуў свае рэзервы. Але раптоўнасць і выразнасць баявых дзеянняў заспелі ворага знянацку. Ад дзеянняў партызан у немцаў гарэла зямля пад нагамі. Ужо 15 снежня савецкія войскі прасунуліся амаль на дзесяць кіламетраў і вызвалілі першы населены пункт Езярышча. Гэты дзень назаўжды ўвайшоў у гісторыю населенага пункта як самы важны.

Месцам памяці і смутку, да якога ўдзячныя жыхары раёна праз 80 гадоў прынясяць кветкі, з'яўляецца магіла камандзіра 159-й танкавай брыгады 1-га танкавага корпуса Сямёна Паўлавіча Хайдукова, які загінуў тут падчас наступальнай аперацыі. На магіле Хайдукова, аднаго з герояў вызвалення, і іншых удзельнікаў аперацыі ўзведзены незвычайны помнік — танк Т-70, рэальная баявая машына, адна з 16, якая была падбіта паблізу Езярышча ў 1943 годзе. Там жа яна і знаходзілася на невялікім пастаменце, а затым была перанесена на мемарыял у цэнтры. Мясцовую славутасць у 2010 годзе хацелі вывесці на Алею Славы ў Віцебск, але жыхары пасёлка выступілі супраць гэтай ініцыятывы і абаранілі сваю галоўную рэліквію. Сёння яна з'яўляецца для нашчадкаў сімвалам неверагоднай моцы і нязломнага духу герояў-вызваліцеляў, а яшчэ нагадвае, якой вялікай цаной была заваявана перамога. Імя камандзіра Хайдукова носіць і адна з вуліц гарадскога пасёлка сёння.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ЗА КОЖНЫМ ІМЕМ — ПОДЗВІГ

**Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага 12 воінскім злучэнням і часцям Чырвонай Арміі, якія вызначыліся ў баях за вызваленне Гарадка, былі прысвоены ганаровыя найменні «Гарадоцкія». У гэты ж дзень у Маскве ў іх гонар былі выпушчаны 12 артылерыйскіх залпаў. Асабоваму складу, які прымаў удзел у тых гераічных падзеях, была аб'яўлена падзяка Іосіфа Сталіна. За вызваленне Гарадка 30 чалавек былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.**

Сярод іх — **Іван Антонаў**. Ураджэнец Валгаграда ў Чырвоную Армію быў прызваны ў 1937 годзе. На фронце — з 1941 года. 16 снежня 1943 года танкавая рота, якой камандаваў капітан Антонаў, прарвала абарону каля вёсак Мехавое, Дражакі, уварвалася ў населены пункт Быкі і прыняла няроўны бой з гітлераўцамі, якія прарываліся з акружэння на станцыі Бычыха. Калі танк выйшаў са строю, Іван Антонаў зняў з яго кулямёт і заняў абарону. На жаль, у гэтым баі ён загінуў. Пахаваны адважны воін у брацкай магіле ў вёсцы Мехавое. Помнік герою ўстаноўлены ў вёсцы Быкі.

Сваю Зорку Героя **Мікалаю Забродзіну** пашчасціла атрымаць пры жыцці. Ураджэнец Пензенскай вобласці, у 1932 годзе скончыў Ташкенцкае кавалерыйскае вучылішча. На фронце — з першых дзён вайны. Вызначыўся пры вызваленні Віцебшчыны. 15 снежня 1943 года полк пад камандаваннем падпалкоўніка Забродзіна авалодаў участкам шашы каля вёскі Кузьміна Гарадоцкага раёна. Байцы перарэзалі камунікацыі, якія звязвалі буйныя групіроўкі праціўніка. 16 снежня полк быў акружаны гітлераўцамі, але ў складанай абстаноўцы падраздзяленне здолела адбіць усе варожыя атакі і злучыцца са сваімі войскамі. Падчас гэтых баёў чырвонаармейцы знішчылі 15 танкаў, 40 аўтамашын, шмат іншай тэхнікі ворага, каля 700 гітлераўцаў. Да 1954 года Мікалай Забродзін служыў у савецкай арміі, жыў у Днепрапятроўску.

Пасмяротна звання Героя Савецкага Саюза быў удастоены **Уладзімір Краеў**. У Чырвоную Армію ўраджэнец Кіраўскай вобласці трапіў у 1940 годзе, на фронце з'яўляўся камандзірам танка. Падчас прарыву варожай абароны каля вёсак Рассядзенне, Вялікая Будніца і Жукава Мехаўскага раёна Віцебскай вобласці разам з экіпажам лейтэнант знішчыў супрацьтанкавую гармату, тры агнявыя пункты праціўніка. Каля вёскі Марчанкі Уладзімір Краеў на працягу дзвюх гадзін вёў бой з гарнізонам праціўніка, знішчыў дзве супрацьтанкавыя гарматы, пяць кулямётаў, захапіў дзве аўтамашыны. За чатыры дні экіпаж Краева з боем прайшоў 40 кіламетраў, вызваліў 15 населеных пунктаў. Камандзір танка быў паранены, але, нягледзячы на раненне, застаўся ў страі. Загінуў 10 лютага 1944 года. Пахаваны ў вёсцы Старое Сяло Віцебскага раёна. На магіле героя ўстаноўлены помнік.

Яшчэ адзін уладальнік найвышэйшага звання, які вызначыўся пры вызваленні Гарадоцкага раёна, — **Іван Кручкоў**. З 1942 года камандзір узвода разведкі гвардыі старшы сяржант — на Варонежскім, Цэнтральным і І-м Прыбалтыйскім франтах. 13 снежня 1943 года разведчыкі першымі ўварваліся на станцыю Бычыха і за пяць дзён баёў адбілі 11 контратак праціўніка. За гэты подзвіг у ліпені 1944 года Іван Кручкоў быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Дачакаўся Перамогі. Пасля вайны працаваў наладчыкам, механікам на торфпрадпрыемстве, слесарам на заводзе. Жыў у Маскоўскай вобласці, пайшоў з жыцця ў 1985 годзе.

Зорку Героя ўраджэнец Іванаўскай вобласці **Аляксандр Цюрын** атрымаў пасмяротна. На фронт трапіў у лістападзе 1941 года. Будучы памочнікам камандзіра ўзвода 240-га стралковага палка 117-й стралковай дывізіі (4-я ўдарная армія, Калінінскі фронт), 11 кастрычніка 1943 года старшына пад агнём праціўніка ў раёне безыменнай вышыні падпоўз да варожага дзота і закідаў яго гранатамі. У выніку знішчыў кулямёт і некалькі гітлераўцаў. Нягледзячы на раненне, працягваў бой. 17 кастрычніка падчас наступлення на вёску Крыцкі Гарадоцкага раёна знішчыў варожую гармату. У гэтым баі адважнага воіна не стала. Байцы пахавалі свайго таварыша ў вёсцы Гуркі, на Гарадоччыне. Высокага звання ён быў удастоены ў чэрвені 1944 года.

Пяці ўдзельнікам баёў за вызваленне Гарадка ў пасляваенныя гады было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Гарадка». Свае імёны ў гісторыю гэтага населенага пункта ўпісалі камандзір дывізіёна 7-й гвардзейскай мінамётнай брыгады Уладзімір Буцэнка, начальнік артылерыі 40-га гвардзейскага стралковага палка 11-й гвардзейскай стралковай дывізіі палкоўнік Рафгат Валіеў (пасля вайны — генерал, лаўрэат Ленінскай прэміі СССР), камандзір узвода лейтэнант Рувім Кажэўнікаў і інструктар палітаддзела 11-й гвардзейскай стралковай дывізіі падпалкоўнік Міхаіл Познін, а таксама памочнік камандзіра разведвальнага ўзвода 14-га стралковага палка 72-й стралковай дывізіі 21-й арміі старшы сяржант Іван Дарошчанка.

**Вераніка КАНЮТА, Барыс ДАЎГАТОВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

Напярэдадні

# СВЕТЛАЕ СВЯТА

**Нараджэнне Хрыстова — адно з найбольш важных і значных свят для хрысціян. Як тлумачаць прадстаўнікі Праваслаўнай царквы, у дні Раства перад намі прыадкрываецца таямніца нараджэння Сына Божага: Хрыстос прыняў чалавечае цела, каб даць людзям магчымасць духоўнага збаўлення.**

«Нараджэнне Хрыстова — падзея, якая змяніла ход сусветнай гісторыі і ўнутрана змяніла чалавека, — падкрэслівае **старшыня Сінадальнага аддзела па культуры і царкоўным мастацтве Беларускай праваслаўнай царквы протаіерэй Іаан ЗАДАРОЖЫН.** — Традыцыі святкавання праваслаўнага Раства ў Беларусі маюць шматвяковую гісторыю. Але, выконваючы іх, важна разумець галоўнае — сутнасць свята. Новы год — гэта толькі змена ў лічбах, а Нараджэнне Хрыстова — сутнасная перамена, якая павінна з намі адбывацца. Гэта штогадовае абнаўленне: мы павінны задумацца аб тым, якімі мы сталі за год, што ў нас варта змяніць праз далучэнне да Хрыста Збавіцеля».

— Раства — адно з галоўных свят праваслаўнай царквы, — дадае **рэгент і мастацкі кіраўнік Архіерэйскага хору Свята-Духава кафедральнага сабора Мінска Віталь САБАЛЕЎСКІ.** — І важна прыйсці да гэтага свята светлымі і ачышчанымі.

## ГАСПОДЗЬ І МАЛЫЯ ДАРЫ НЕ АДМАЎЛЯЕ

Калядны пост папярэднічае святу. Сучасныя людзі, посцячыся, часам засяроджваюцца толькі на знешнім, абрадавым баку, падкрэсліваюць прадстаўнікі праваслаўнай царквы. Між тым, кажучы аб дыеце, мы ставім сабе за мэту папраўдзь здароўе. Мэта посту — іншая. Гэта сродак, які вядзе да Бога. Пост не ставіць задачай паляпшэнне фізічнага стану чалавека (хоць гэта адбываецца), ён патрабуе духоўнай працы над сабой. Можна вытрымліваць пост, але пры гэтым заставацца ў стане раздражнення, негатыўных эмоцый. Толькі духоўная праца надае посту сэнс. Абмежаванні ў ежы даюць магчымасць чалавеку абмяжоўваць у сабе страсці.

— Калядны пост не такі строгі, як Вялікі або Успенскі. Ён дазваляе ўжыванне рыбы, — тлумачыць протаіерэй Іаан Задарожын. — Але трэба разумець, што ўстрыманне падчас посту — толькі сродак для трэніроўкі духу. Важна захоўваць духоўны пост, які ўключае засяроджанасць і разважанні. Чалавек выходзіць са звыклага кола, каб асэнсаваць самога сябе, сваё жыццё. Царква гаворыць аб тым, што трэба абмежаваць сябе на гэты час у забавах і іншых мітуслівых справах. У мітусні чалавек не заўважае галоўнага — сваёй душы, таго, куды рухаецца яго жыццё. Пост жа павінен быць спалучаны з павелічэннем часу для малітвы, чытання Псалтыры, дапамагае сканцэнтраваць увагу на духу. Таму напярэдадні посту важна ставіць сабе духоўныя задачы. Няхай не засцёды яны дасягаюцца цалкам, але Гасподзь і малыя дары прымае. І пост — якраз той дар, які мы можам прынесці Богу, як і добрыя справы.

## КАЛЯДЫ Ў КОЖНУЮ ХАТУ

На Раство на Беларусі заўсёды калядавалі: дзеці — днём, моладзь — калі сцямнела. Вясёлыя гурты хадзілі па дварах, віншавалі суседзяў з Нараджэннем Хрыстовым, спявалі калядкі і збіралі дары — прысмакі.

— Мы імкнёмся адрадзіць гэтую традыцыю, — расказвае **старшыня брацтва ў гонар апостала Іаана Багаслова пры Свята-Духавым саборы горада Мінска Марыя ШАПЛЫКА.** — У мінулым годзе, напрыклад, праводзілі акцыю «Каляды ў кожную хату», нас запрашалі ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і нават у сем'і павіншаваць дзяцей. Цяпер праходзіць конкурс песень і калядак, які аб'ядноўвае ўсіх, хто святкуе Раство. Трэба запісаць калядку і даслаць нам, у выніку мы пакажам, як Нараджэнне Хрыстова святкуецца ў розных кутках нашай Радзімы.

Сёлета 7 студзеня будзе праходзіць Мітрапалітчая калядная ёлка: у Нацыянальную бібліятэку запрошаны шматдзетныя сем'і, сем'і святароў, а таксама ўрачоў, дадала старшыня брацтва ў гонар апостала Іаана Багаслова.

Рабіць падарункі родным і блізкім на Раство — традыцыя, якая бярэ пачатак ад тых дароў, якія прынеслі Немаўляці Ісусу валхвы. Дабрачыннасць у гэты дзень асабліва важная, бо Нараджэнне Хрыстова — выдатная нагода дапамагчы тым, хто больш за іншых мае патрэбу ў гэтым.

— У дні Раства мы па традыцыі праводзім дабрачынныя акцыі, — адзначае Марыя Шаплыка. — Напрыклад, дабрачынная акцыя «Раство прыходзіць да кожнага» па зборы падарункаў шматдзетным сем'ям, інвалідам, людзям, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі.

Святы вечар напярэдадні Раства мае асаблівае значэнне. У гэты дзень традыцыя загадвае строгі пост: да першай зоркі есці нельга.

— Першая зорка — не тая, якая запальваецца на небе, — распавядае Віталь Сабалеўскі. — Зоркай лічыцца свечка, якая падчас службы выносіцца і запальваецца ў храме, калі спяваецца трапар, дзе гаворыцца пра сэнс свята. Потым гэтая свечка стаіць каля цэнтральнага абраза.

У вечар перад Раством на стол выстаўляецца куцця. Першапачаткова страву гатавалі з ячменю ці пшаніцы, дадаючы мёд. Сёння ў куццю дадаюць цукаты, мак, арэхі, яе гатуюць з розных круп. Нягледзячы на тое, што трапеза посная, па традыцыі яна павінна быць багатай: на стол нашы продкі выстаўлялі 12 страў, па колькасці апосталаў. Рыбныя стравы, салёныя грыбы, агуркі і памідоры, кашы, вараная ці запечаная бульба, посныя пірагі, дранікі, вінегрэт, квас, галубцы без мяса, варэнікі з капустай... Усё гэта ставілася на стол, накрыты белым абрусам, пад якім было сена — у памяць аб першай калысцы-яслях, куды паклалі нованароджанага Хрыста, і як сімвал, што Ісус прыйшоў на Зямлю не сярод раскошы, а ў прастаце і пакоры.

Зразумела, галоўная традыцыя святкавання Раства — наведванне храма. Без богаслужэнняў, якія апісваюць гэтую евангельскую падзею, немагчыма адчуць усю яе прыгажосць, гавораць святары. І, вядома, святкаванне Раства ў коле сям'і — гэта ў першую чаргу не застолле, а духоўныя зносіны, час, якія важна прысвяціць блізкім, а таксама добрым справам і добрым думкам. А стварэць патрэбны настрой канцэрты Архіерэйскага хору, якія ў гэтым студзені адбудуцца ў Слуцку, Брэсце, Нясвіжскім замку і Белдзяржфілармоніі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# 11 НАЙМЕННЯЎ МАНЕТ

**Як паведаміла ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка краіны, сёлета фінансавы рэгулятар плануе выпусціць у абарачэнне 11 найменняў памятных манет.**

Тэматыка гісторыка-культурных каштоўнасцяў будзе працягнутая памятнымі манетамі: «Старажытны лад» серыі «Беларускі народны касцюм», «Былінка і верабей» серыі «Беларускія народныя казкі», «Загадкі» серыі «Беларускі дзіцячы фальклор», «Бацька» серыі «Дрэва жыцця», а таксама памятнымі манетамі серыі «Гісторыя беларускай чыгункі. «Цягнікі»: «Паравоз», «Цеплавоз», «Электравоз», «Дызель-цягнік», «Электрацягнік».

Таксама выпуск памятных манет будзе прымеркаваны да юбілейных дат: 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзя ўводу ў абарачэнне на тэрыторыі краіны беларускага рубля, 25-годдзя падпісання дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, 10-годдзя заснавання Еўразійскага эканамічнага саюза і 200-годдзя з пачатку будаўніцтва Аўгустоўскага канала.

Выпуск памятных манет на прыродаахоўную тэматыку будзе працягнуты манетамі «Варона шэрая» серыі «Птушка года».

**Сяргей КУРКАЧ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»**

**22 января 2024 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Стоимость с учетом снижения на 70 %, без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 2 | Автогрейдер ДЗ-98 В 7.2, заводской номер 3150СП, год выпуска 2001, регистрационный знак 9188 БЮ, инвентарный номер 383 | 10020,00 | 1002,00 |

1. Дата, время и место проведения повторного аукциона: **22 января 2024 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

2. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

3. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

4. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **16.01.2024 г.,** время: **17.00.**

5. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

6. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

7. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 11.11.2023, а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

УНП 700049607



Центр Промышленной Оценки

• **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**

• **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ПКУП «Жилкомплект», г. Минск, ул. Аннаева, 67 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**АДМИНИСТРАТИВНО-БЫТОВОЙ КОРПУС (здание административно-хозяйственное),**
инв. номер 500/С-29355, общ. пл. 540 кв. м.
Адрес: г. Минск, ул. Аннаева, д. 67.
Ограничение/обременение: аренда.
**Начальная цена с НДС 20 % – 684 000,00 бел. руб.**
Шаг торгов – 34 200,00 бел. руб.

Земельный участок с кадастровым номером 500000000001036152 общ. пл. 3,0484 га предоставлен продавцу для строительства и обслуживания здания многофункционального, зданий административно-хозяйственных, здания обрабатывающей промышленности иного назначения, зданий специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ на праве общей долевой аренды до 31.10.2030 (284/625)

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Александр, тел. +375 29 676 74 33

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 06.02.2024.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются **до 17.00 05.02.2024** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Минского городского исполнительного комитета (https://minsk.gov.by/) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by) от 05.01.2024 г.

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 317-95-42.
**E-mail:** auction@cpo.by



ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Погостский сельский исполнительный комитет**

извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу:
**Минская область, Березинский район, аг. Погост, ул. Заречная, д. 16**
(согласно регистрации земельного участка – адрес: д. Погост.),
**имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 5 х 7 м.

Площадь: 35,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: неизвестна.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Отсутствуют окна, двери, полы, стены сеней, крыша в аварийном состоянии.

Сведений о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: Усов Евгений Петрович, дом зарегистрирован в БТИ.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Погостский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Погостский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Погостский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 6 43 25, 801715 6 22 33, 801715 6 13 78.**

УНП 600092490



О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**аг. Погост Березинского района Минской области**

Погостский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: **Минская область, Березинский район, аг. Погост, ул. Заречная, д. 16** (правообладатель: Усов Евгений Петрович, адрес дома: д. Погост).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Погостский сельисполком по телефонам: **801715 6 43 25, 801715 6 22 33, 801715 6 13 78** (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: **223320, Минская область, Березинский район, ул.Советская, 4.**

Электронный адрес: **pogoctss@berezino.gov.by.**

УНП 600092490

# «ЯНЫ АДБЫВАЮЦЦА З ТЫМІ, ХТО Ў ІХ ВЕРЫЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Да многіх цудаў мы ўжо настолькі прызвычаіліся, што не ўспрымаем іх як цуд.** Напрыклад, як з маленькага зярнятка вырастае яблыня, якая дае плады. Нараджэнне дзіця — гэта наогул найвышэйшы цуд. Мне аднойчы давялося з акушэркай прымаць роды, бо жанчына не паспела даехаць да радзільні. Памятаю, і ў студэнцтве неаднаразова прысутнічаў на родах. І кожны раз, калі з'яўлялася на свет дзіця і раздаваўся яго першы крык, я адчуваў звышнатуральнасць. Дарэчы, сына я ўзяў на рукі нават раней, чым жонка. Гэта неперадавальныя цудоўныя адчуванні.

**Шмат год таму мы ездзілі адпачываць з сям'ёй у Алушту на мора.** Кожны раз перад тым, як мы збіраемся ехаць у дальнюю дарогу, я заказваю малебен аб падарожных. І вось прыходзім мы на пляж і сустракаем там знаёмых бацюшку з матушкай. Яны прызналіся, што напярэдадні нашага з'яўлення бачылі сон — ідзе хрэсны ход, і я іду ў гэтым хрэсным ходзе. І тут жа праз пару гадзін сустракаюць мяне на пляжы. Напэўна, пасля малебна я ехаў туды ў суправаджэнні святых. Яны нас ахоўвалі, і я гэта адчуваў, бо былі ў дарозе некалькі непрыемных выпадкаў, у тым ліку і з машынай праблемы, але ўсе яны вырашаліся, і мы даехалі паспяхова.

**Тры гады таму мой сын трапіў у аварыю.** Ехаў па галоўнай дарозе, а збоку, з другараднай дарогі, нечакана выскачыла машына і знесла ўвесь перад. Машына не падлягае аднаўленню, а ў сына ні драпіны. Аднойчы я сам перанёс клінічную смерць, пасля аперацыі мяне не маглі вывесці з наркозу. Але, як бачыце, я тут сяджу і з вамі размаўляю, жартую, жыву напоўніцу. Ці ж гэта не цуд!

**Штогод напярэдадні Вялікадня ўсе, як цуду, чакаюць Сыходжання Жыватворнага агню ў Іерусаліме.** А зімой, у ноч з 3 на 4 снежня, калі праваслаўныя вернікі святкуюць вялікае свята Увядзення ў храм Прасвятой Багародзіцы, якім бы ні было надвор'е, нядоўга распускаюцца почкі вярбы. Убачыць гэты цуд прыроды, які адбываецца незадоўга да 12 гадзін ночы, можа кожны. Але я неяк не адважваюся праверыць, праўда гэта ці не.

**Большасць беларусаў, якія кажуць, што не вераць у цуды, насамрэч вераць у іх.** Бо, калі нехта штосьці расказвае, у нас ёсць такое выказванне: «Гэтага не можа быць!..» Значыць, калі гэтага не можа быць, а яно адбылося, дык гэта ўжо цуд. Акрамя таго, часта можна пачуць: «Якое ЦУДоўнае надвор'е!» Значыць, яно нейкае незвычайнае. І гэта таксама цуд. Мы нядаўна ездзілі да пляменніка ў лазню і раніцай, калі прачнуліся, убачылі за акном заснежаныя дрэвы. Я папрасіў, каб мяне сфатаграфавалі на гэтым казачным фоне. Калі паказваю камусьці тое фота, кажу: «Вы не на мяне глядзіце, а на цуд за акном». Ці вось фотаздымкі цудаў Язненшчыны, якія ўпрыгожваюць сцены ў нашай амбулаторыі. На адным з іх наша Спаса-Праабражэнская царква, з якой як быццам узыходзіць вясёлка. Дарэчы, ёй больш як 120 гадоў, і яна ні разу за гэтыя гады не закрывалася. Хіба гэта не цуд?



Уладзімір Пятровіч штогод дапамагае Мікалаю Цудатворцу дарыць казку і радасць людзям.

## Пра споведзь, святую ваду ды душэўны спакой

**Перш чым пачаць лячэнне, я ўсім раіў бы спачатку паспавядацца, прычасціцца.** Я не кожнаму пацыенту гэта магу сказаць. Толькі блізкім сваякам, якія прыходзяць да мяне лячыцца. Калі ў нас раней была ўчастковая бальніца, бабулі, якія кладіся ў стацыянар, самі прасілі, каб святар прыходзіў іх спавядаць. Заўважыў, што ў людзей, якія паспавядаліся і прычасціліся, вылячэнне ідзе хутчэй, і эфект ад лячэння добры. Асабліва, калі штодзень чытаюць ранішнія ды вячэрнія малітвы.



«Суседка, даведаўшыся аб маім захапленні, прынесла старую дзежку. Паўстагоддзя яна ляжала на гарышчы, і вось зноў для яе знайшлася справа».

**Фізічнае і духоўнае здароўе чалавека цесна ўзаемазвязаны.** Недарэмна кажуць, што ўсе хваробы ад нерваў, а нервы — ад грахоў. Калі мы прызнаём свае грахі і шчыра каемся ў іх, як правіла, нармалізуецца нервовая сістэма і чалавек ідзе на папраўку. Бацюшка Аляксандр часта кажа, што чалавек у сваім жыцці павінен імкнуцца дасягнуць душэўнага спакою. Тое, што адбываецца вакол — як станоўчыя моманты, так і адмоўныя — ён павінен успрымаць са спакоем у душы. Калі дасягнем такога спакою, працсей будзе жыць. А калі б усе дасягнулі гэтага стану, напэўна, быў бы рай на зямлі.

**Яшчэ адзін цуд — асвячоная на Хрышчэнне вада.** Яна захоўваецца цэлы год і не псуецца. Ці тыя ж самыя святыя крыніцы. Недалёка ад Язна знаходзіцца крыніца Святога Яна (Іаана Хрысціцеля), яна славіцца чыстай гаючай вадой, якая вылечвае ад многіх хвароб, прыносіць дадатковае здароўе. Па адной з легенд падарожнік убачыў над лесам у вёсцы Чарневічы крыж, падышоў бліжэй — а там крыніца. Пасля нейкі сляпы старац у пошуках вады пачуў гук той крыніцы, памыўся гаючай вадой і стаў відушчым. Пасля гэтых падзей месца лічыцца святым. Неабыякавыя мясцовыя жыхары добраўпарадкавалі крыніцу, зрабілі зручны падыход, узвялі купель, каплічку.

**Наколькі крынічная вада дзейсная, залежыць ад чалавека. Ад яго веры.** Калі пацыент не давярае доктару, то яму трэба памяняць доктара. Так і з крынічнай вадой. Калі чалавек шчыра верыць, што вада яму дапаможа, то вялікая верагоднасць, што так яно і здарыцца. Бо кожнаму даецца па веры яго.

**Ля крыніцы я адпачываю душой, там цудоўная энергетыка.** Калі б там ляжала кніга, куды б людзі запісвалі цуды аб вылечванні... А так калі з некім адбыўся цуд, не кожны пойдзе і раскажа пра яго. Гэтаксама, як у прытчы пра 10 пракажоных. Яны сустрэлі Ісуса Хрыста і папрасілі вылечыць іх. Ён жа сказаў ім пайсці і паказацца святарам. Па шляху да святароў ва ўсіх дзесяці пракажоных зніклі язвы на целе. Але толькі адзін з іх зразумеў, што іх вылечыў Ісус. Ён вярнуўся, каб падзякаваць Яму. Ісус сказаў яму, што гэта яго вылечыла вера. А астатнія дзевяць, атрымаўшы выратаванне ад цяжкай цялеснай немачы, яшчэ невядома, ці сталі здаровымі духоўна, ці скарысталіся яны сваім здароўем для выратавання душы, бо далёка не заўсёды ў здаровым целе жыве здаровы дух.

## Пра пажар, жывы хлеб ды бісквітную ружу

**Дзесяць гадоў таму здарылася няшчасце — згарэў наш дом.** Божая міласць, што пажар здарыўся днём, калі ўсе суседзі былі на дварэ. Менавіта яны ўбачылі, што з-пад даху ідзе дым, пазванілі мне на працу, прыбеглі, усю мэблю вынеслі за лічаныя хвіліны. У нас дом быў шчытавы, абкладзены цэглай. Калі б пажар здарыўся ноччу, мы б згарэлі ўсе зажыва.

**Я тады параўноўваў сябе з мурашом, які поўз-поўз, і яго страсянулі з галінкі.** Пасля гэтага ён падняўся і зноў пачаў паўзці ўверх. Нам таксама прыйшлося пачынаць усё спачатку. Пасля пажару мы за адзін дзень прыбралі, пагрузілі на машыну і вывезлі рэшткі дома. Машын чатырнаццаць было побач з папялішчам — прыехалі падтрымаць сябры, сваякі. Ніводных выхадных не было, каб я працаваў адзін. Менавіта ў такія моманты разумееш, што адзін у полі не воін, а сапраўднае сяброўства — гэта цуд. Усе здзіўляліся, што мы адбудавалі дом за 8 месяцаў. 17 сакавіка ў нас здарыўся пажар, і ўжо 17 лістапада бацюшка асвячаў новы дом. Паверце, аднаму гэта зрабіць немагчыма.

**Калі з чалавекам здараецца нейкая бяда, усе звычайна пытаюцца: «За што Бог так мяне пакараў?»** Я ж для сябе па-іншаму паставіў пытанне: «Для чаго Бог паслаў мне такое выпрабаванне?» Перад тым як здарыўся пажар, мы практычна цалкам зрабілі капітальны рамонт, заставалася толькі дарабіць пакой сына. Памятаю, напярэдадні пажару я прыйшоў з царквы, лёг на ложак адпачыць і падумаў: «Як жа добра! Нарэшце я дасягнуў такога матэрыяльнага дабрабыту, пра які можна было толькі марыць». Напэўна, Бог палічыў, што я рана радуюся... Пасля пажару я па-іншаму пачаў глядзець на жыццё. Больш духоўнага хочацца, чым матэрыяльнага. Доўгія гады мы шмат сіл і часу ўкладвалі ў дасягненне матэрыяльнага дабрабыту, і ў адзін момант усё знікла. Думаю, праз гэтую сітуацыю Бог паказаў мне на недаўгавечнасць усяго матэрыяльнага. А яшчэ, што трэба больш часу ўдзяляць жонцы і сыну, пажар вельмі з'яднаў нашу сям'ю.

**Тэхналогія выпечкі хлеба, які я пяку ўжо пяць гадоў, унесена ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.** Усе ў мяне пытаюцца, што ў ім такога асаблівага? Асаблівасць менавіта ў прастаце. У чацвер на ноч я разводжу закваску з вадой. Праз 12 гадзін раніцай раблю рашчыну: дадаю да закваскі жытнюю цэльназерневую муку. Праз 12 гадзін, ужо вечарам, замешваю цеста — дадаю яшчэ мукі, соль, цукар, кмен па смаку. Затым чакаю, пакуль цеста падыдзе ў цёплым месцы. І выпякаю ў духоўцы пры 230 градусах дзесяці гадзіну. Я ніколі не пачынаю выпякаць хлеб, не памаліўшыся. На цесце заўсёды малюю крыжык. Гэты рэцэпт каштоўны тым, што не мяняецца на працягу больш як 200 гадоў. Узяў я яго ў жыхаркі вёскі Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна Сцепаніды Лупач. Дарэчы, з гэтай бабуляй мяне цудоўным чынам звёў лёс.

**Пачалося ўсё з таго, што мы з сынам глядзелі перадачу пра бабулю, якая пячэ хлеб па старадаўняй тэхналогіі.** І сын кажа: «Ой, тата, я таксама хачу пакаштаваць такога хлеба». «Дзе ж мы возьмем тую закваску?» — пацiснуў я плячыма... І вось праз гады чатыры мы паехалі ў адну з цэркваў Глыбоцкага раёна на службу з нагоды саракавіны з дня смерці бацькі нашых сяброў. Пасля службы мне даручылі забраць бацюшку і прывезці яго на клады, каб асвяціць магілку. Па дарозе ён мне кажа: «Валодзя, давай на хвілінку спынімся вось ля гэтай хаты, квасу возьмем». — «Якога квасу?» — «З якога хлеб пякуць». І вось мы заходзім у тую хату, і я бачу бабулю, якую чатыры гады таму бачыў па тэлевізары. Яна і мне таксама дала таго квасу (ці раўгеню, як называюць у народзе), і распавяла, як з яго пячы карысны жытнік. Дагэтуль памятаю яе маўтаўлівае настаўленне, маўляў, усё атрымаецца, «хлеб не нявестка, з'ядзім і новы спячом». З таго часу мы ў краме хлеб не купляем.

**Многія скардзяцца, што ў вёсцы сумна жыць.** Але ў мяне наконт гэтага іншае меркаванне. Я з дзяцінства прывучаны да таго, што забаўляць сябе трэба самому, удзельнічаў са школы ва ўсіх канцэртах у вясковым клубе. Калі мы больш як 20 гадоў таму пераехалі ў Язна, адразу ж пачалі наведваць царкву. Бацюшка даведаўся, што я спяваю, і запрасіў у царкоўны хор. Наш сын пайшоў у дзіцячы садок. І, як звычайна, на Новы год сярод бацькоў шукалі Дзеда Мароза. Выбралі мяне. З таго часу я кожны год пераўтвараюся ў чараўніка. Потым мяне запрасілі ў фальклорны ансамбль «Язынка». Я ініцыяваў розныя мерапрыемствы ў вёсцы, бо хацеў, каб сыну і жонцы было цікава тут жыць. 10 гадоў запар я быў адным з арганізатараў і ідэйным натхняльнікам фестывалю нядзельных праваслаўных школ «Язненскі дабравест». Пару гадоў таму перад Новым годам мы з калегамі вырашылі ўпрыгожыць нашу амбулаторыю святочнай ілюмінацыяй. Нашу ініцыятыву падхапілі школа, царква, клуб. Калі не сядзець, склаўшы рукі, то можна зрабіць жыццё ў вёсцы весялейшым. Дарэчы, мы з жонкай бываем у Вялікім тэатры оперы і балета, у музеях, на выставах, канцэртах часцей, чым некаторыя мінчане. Я заўсёды кажу: калі ёсць жаданне, магчымасць заўсёды можна знайсці. Ёсць прымаўка: «Добра там, дзе нас няма». Дык вось я яе перафразаваў: «Добра там, дзе мы ёсць». Калі чалавек будзе так думаць, то — гэта праверана — жыццё зайграе іншымі фарбамі.

**Ёсць тры стадыі сталення мужчыны. 1. Ён верыць у Дзеда Мароза. 2. Ён не верыць у Дзеда Мароза. 3 Ён сам Дзед Мароз.** Другая стадыя прайшла міма мяне, бо я стаў Дзедам Марозам яшчэ ў школе. І працягваю ў яго верыць. Бо калі прыходжу на свята і пераконваю дзіця, што я сапраўдны, то сам павінен верыць у гэта. Лічу, што гэта пачэсная місія — быць памочнікам Мікалая Цудатворца, дапамагаць яму дарыць казку і радасць людзям.

*Іна, жонка Уладзіміра, расказала, што з мужам ёй сумаваць не даводзілася ніколі, ён заўсёды штосьці прыдумляе. Адным такім цудам, зробленым сваімі рукамі, ён шмат гадоў таму і пакарыў яе сэрца):* **«Памятаю, хтосьці прынёс у школу жаночы часопіс, і ўсе дзяўчаты прыняліся перапісваць рэцэпт бісквітных ружачак.** Я перапісала таксама. «Іна, дай і мне перапісаць», — папрасіў Валодзя, мы з ім вучыліся ў адным класе. — «Ай, навошта табе гэта? — адмахнулася я. — «Ну, дай, калі ласка». У выніку дзяўчаты перапісалі і забыліся на той рэцэпт. Валодзя ж на наступны дзень паклікаў мяне, адкрыў свой белы дыпламат — і, што вы думаеце, там ляжала тая самая бісквітная ружачка з часопіса».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.**

*Мёрскі раён.*

## Ад аўтара

Знаёмства з вясковым доктарам стала і для мяне асабістым цудам. Пяць гадоў таму, падчас дэкрэтнага адпачынку, я пякла хлеб на заквасцы. Але калі выйшла на працу, закінула гэтую справу, аб чым не раз шкадавала. Уладзімір Пашковіч, пачуўшы пра гэта, падзяліўся са мной закваскай. Больш за тое, сваімі словамі, што выпечка хлеба — мужчынскі занятак (бо каб добра вымесіць цеста, патрэбна шмат сілы), паспрыяў таму, што муж пачаў мне дапамагаць...




Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

### Студзень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

### Люты

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | | | |

### Сакавік

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

### Красавік

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |

### Май

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

### Чэрвень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

### Ліпень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

### Жнівень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

### Верасень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | | | | | | |

### Кастрычнік

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

### Лістапад

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

### Снежань

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

# *КАНФЕСІЙНЫ КАЛЯНДАР*

## *Праваслаўны каляндар*

**5 мая — Светлае Уваскрэсенне Хрыстова. Пасха. Вялікдзень**

### Двунадзясятыя святы

*7 студзеня, нядзеля ...... Раждажство Хрыстова*
*19 студзеня, пятніца ..... Хрышчэнне Гасподняе*
*15 лютага, чацвер ......... Стрэчанне Гасподняе*
*7 красавіка, нядзеля ...... Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы*
*28 красавіка, нядзеля .... Уваход Гасподні ў Іерусалім. Вербная нядзеля*
*13 чэрвеня, чацвер ........ Узнясенне Гасподняе*
*23 чэрвеня, нядзеля ...... Дзень Святой Тройцы. Пяцідзясятніца*
*19 жніўня, панядзелак ................... Праабражэнне Гасподняе*
*28 жніўня, серада .......... Успенне Прасвятой Багародзіцы*
*21 верасня, субота ........ Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы*
*27 верасня, пятніца ....... Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга*
*4 снежня, серада ........... Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы*

### Вялікія святы

*14 студзеня, нядзеля ..... Абрэзанне Гасподняе і памяць свц. Васілія Вялікага*
*7 ліпеня, нядзеля ........... Нараджэнне Іаана Прадцечы*
*12 ліпеня, пятніца ........... Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла*
*11 верасня, серада ........ Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы*
*14 кастрычніка, панядзелак ..................... Пакроў Прасвятой Багародзіцы*

### Саборы Беларускіх святых

*14 ліпеня, нядзеля ......... Сабор Беларускіх святых*
*3 лістапада, нядзеля...... Сабор навамучанікаў і вызнаўцаў зямлі Беларускай*

### Шматдзённыя пасты

*Вялікі пост ...................... з 18 сакавіка да 4 мая*
*Пятроў пост ..................... з 1 да 11 ліпеня*
*Успенскі пост................... з 14 жніўня да 27 жніўня*
*Пост перад Раждажством Хрыстовым ..................... з 28 лістапада да 6 студзеня 2025 года*

### Аднадзённыя пасты

*(Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усёедных тыдняў і Каляднага перыяду)*

*Навячэр'е Богаяўлення .................. 18 студзеня*
*Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы ............ 11 верасня*
*Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга ......... 27 верасня*

### Усёедныя тыдні

*(па серадах і пятніцах посту няма)*

*Калядны перыяд ........... з 7 да 18 студзеня*
*Мытара і фарысея.......... з 26 лютага да 2 сакавіка*
*Сырны (масленічны)...... з 11 да 16 сакавіка*
*Пасхальны (Светлы)...... з 5 да 11 мая*
*Троіцкі ............................ з 24 да 29 чэрвеня*

### Дні асаблівага памінання спачылых

*Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі ў час ганенняў за веру Хрыстову........... 4 лютага*
*Субота мясапусная........ 9 сакавіка*
*Субота 2-га тыдня Вялікага посту............... 30 сакавіка*
*Субота 4-га тыдня Вялікага посту............... 13 красавіка*
*Памінанне спачылых воінаў ............ 9 мая (пераносіцца на 14 мая)*
*Радаўніца....................... 14 мая*
*Субота Троіцкая............. 22 чэрвеня*
*Памінанне ўсіх праваслаўных, багаборцамі забітых або бязвінна зняволеных ..... 30 кастрычніка*
*Субота Дзімітраўская .... 2 лістапада*

## *Каталіцкі каляндар*

*1 студзеня.............. Святой Багародзіцы Марыі*
*6 студзеня.............. Аб'яўленне Пана (Тры каралі)*
*7 студзеня.............. Хрост Пана*
*21 студзеня............ Нядзеля Божага Слова*
*2 лютага................. Ахвяраванне Пана*
*14 лютага............... Папялец*
*19 сакавіка ............ Святога Юзафа*
*24 сакавіка ............ Пальмовая нядзеля*
*28 сакавіка ............ Вялікі чацвер*
*29 сакавіка ............ Вялікая пятніца*
*30 сакавіка ............ Вялікая субота*
*31 сакавіка ............ Вялікдзень*
*7 красавіка ............ Свята Божай Міласэрнасці*
*8 красавіка ............ Звеставанне Пана*
*9 мая ...................... Унебаўшэсце Пана*
*19 мая .................... Спасланне Духа Святога*
*23 мая .................... Пана нашага Езуса Хрыста, Найвышэйшага і Вечнага Святара*
*26 мая .................... Найсвяцейшай Тройцы*
*30 мая .................... Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста*
*31 мая .................... Адведзіны Найсвяцейшай Панны Марыі*
*7 чэрвеня ............... Найсвяцейшага Сэрца Езуса*
*8 чэрвеня ............... Беззаганнага Сэрца Найсвяцейшай Панны Марыі*
*24 чэрвеня................. Нараджэнне св. Яна Хрысціцеля*
*29 чэрвеня ............. Святых апосталаў Пятра і Паўла*
*2 ліпеня .................. Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай*
*16 ліпеня ................ Найсвяцейшай Панны Марыі з гары Кармэль*
*6 жніўня ................. Перамяненне Пана*
*15 жніўня ............... Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі*
*12 верасня ............. Найсвяцейшага імя Марыі*
*14 верасня ............. Узвышэнне Святога Крыжа*
*2 кастрычніка ......... Святых Анёлаў Ахоўнікаў*
*7 кастрычніка ......... Маці Божай Ружанцовай*
*1 лістапада ............ Усіх Святых*
*2 лістапада .............. Успамін усіх памерлых вернікаў*
*16 лістапада .......... Найсвяцейшай Панны Марыі Міласэрнасці*
*24 лістапада .......... Хрыста, Валадара сусвету*
*1 снежня ................ Першая нядзеля Адвэнту*
*9 снежня ................ Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі*
*25 снежня .............. Нараджэнне Пана*
*29 снежня .............. Святой Сям'і*

## *Лютэранскі каляндар*

*1 студзеня.................. Новы год, Абразанне і нарачэнне імя Ісуса*
*6 студзеня.............. Богаяўленне, Эпіфанія*
*25 студзеня............ Дзень абарачэння святога апостала Паўла*
*2 лютага................. Стрэчанне Гасподняе*
*14 лютага............... Папяльцовая серада, пачатак Пакутнага часу*
*24 сакавіка ............ Вербная нядзеля*
*25 сакавіка ............ Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы*
*28 сакавіка ............ Вялікі чацвер. Дзень усталявання Прычасця*
*29 сакавіка ............ Пакутная пятніца*
*31 сакавіка ............ Вялікдзень*
*25 красавіка .......... Дзень евангеліста Марка*
*9 мая ...................... Узнясенне Гасподняе*
*19 мая..................... Пяцідзясятніца, свята Сашэсця Святога Духа*
*26 мая .................... Тройца, свята Святога Трыадзінства*
*24 чэрвеня ............. Свята нараджэнне Іаана Хрысціцеля*
*25 чэрвеня ............. Дзень Аўгсбургскага веравызнання*
*29 чэрвеня ............. Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла*
*21 верасня ............. Дзень апостала і евангеліста Мацвея*
*29 верасня ............. Дзень архангела Міхаіла і ўсіх анёлаў*
*6 кастрычніка ......... Свята падзякі за ўраджай*
*18 кастрычніка ....... Дзень евангеліста Лукі*
*31 кастрычніка ....... Дзень Рэфармацыі*
*20 лістапада .......... Дзень пакаяння і малітвы*
*24 лістапада .......... Дзень памінання спачылых. Нядзеля Вечнасці*
*24 снежня .............. Куцця*
*25 снежня .............. Раство Хрыстова*
*26 снежня................. Дзень першапакутніка Стэфана*
*27 снежня .............. Дзень апостала і евангеліста Іаана*
*28 снежня ................ Дзень нявінна забітых немаўлят*

## *Іўдзейскі каляндар*

*25 студзеня............ Ту-бі-Шват*
*21 сакавіка ............ Пост Эстэр*
*24 сакавіка ............ Пурым*
*23—29 красавіка.... Песах*
*26 мая .................... Лаг Ба-Омер*
*12—13 чэрвеня ...... Шавуот*
*23 ліпеня................ Пост 17 Тамуза*
*13 жніўня ............... Пост 9 Ава (пачынаецца з вечара 12 жніўня)*
*3—4 кастрычніка ... Рош-ха-Шана. Яўрэйскі Новы год (5785-ы)*
*6 кастрычніка ......... Пост Гедалы*
*12 кастрычніка ....... Ём Кіпур*
*17—23 кастрычніка ... Сукот*
*24 кастрычніка ....... Шміні Ацэрэт*
*25 кастрычніка ....... Сімхат Тора*
*26 снежня — 2 студзеня 2025 г. .... Ханука*

## *Мусульманскі каляндар*

*11 студзеня (29 Джумада аль-ахыра) ....... Ноч Рагаіб*
*6 лютага................. Ноч Мірадж*
*24 лютага............... Ноч Бараат*
*11 сакавіка, субота (1 Рамадана) .......... Пачатак месяца Рамадан*
*5 красавіка, пятніца (26 Рамадана) ........ Ноч Аль-Кадр*
*10 красавіка, серада (1 Шаваля)............. Ураза-Байрам*
*15 чэрвеня ............. Дзень Арафа*
*16 чэрвеня, нядзеля (10 Зуль-хіджа)....... Курбан-Байрам*
*7 ліпеня ................. Новы год па Гіджры*
*16 ліпеня (10 мухарама) ........ Ашура*
*14 верасня (11 Рабіуль-аваля).... Маўлюд ан-Набі.*

Наш культурны асяродак
Жырандоля

# БЕЛАЯ ВЯСЁЛКА Ў ТУМАННАЕ РАННЕ

## Як Вялюгін пісаў закрытую рэцэнзію на Караткевіча

«Снягі і зоры за акном.
Заснулі ў хаце ўсе даўно.
Бярозка юная галлём
Паціху стукае ў акно.
А ты плывеш у белы свет...
Сінее плынь тваіх вачэй...
І найдалейшая з планет
Сяла суседняга бліжэй».

Гэтую песню пад назвай «Бярозка» на музыку Ігара Лучанка беларускі касманаўт Пётр Клімук узяў з сабой у якасці талісмана ў касмічны палёт...

А словы той касмічнай песні належаць паэту Анатолю Вялюгіну, 100-годдзе якога прыпала на апошнія дні 2023 года.



Нарадзіўся паэт у Машканах Сенненскага раёна, частка дзяцінства прайшла на хутары Кляпчэва, пакуль бацька ездзіў у заробкі. «Машканы, Івоні, Ракіты, хутар Кляпчэва — авеяныя лесавым шумам мацерыкі майго маленства», — успамінаў паэт. Дарэчы, яго бацька быў фельчарам, маці — настаўніцай, былой гімназісткай. А прозвішча павінна было быць Вялюга. Але калі бацьку забрывалі ў салдаты яшчэ царскай арміі, яго беларускае прозвішча «ўдасканалілі», так і з'явіўся паэт Анатоль Вялюгін. Які, дарэчы, у 1939—1940-х гадах, пакуль быў студэнтам літфака Мінскага педагагічнага інстытута, працаваў у «Звяздзе».

Давайце даведаемся цікавыя факты пра яго дзякуючы дакументам з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

### Вершы на пуцявінах смерці

Вялюгіну было сямнаццаць, калі пачалася вайна. Якія складаліся планы! У 1940-м паралельна з навучаннем на літаратурным факультэце Мінскага педінстытута і працай у «Звяздзе» ён нават прайшоў курс кінематаграфічнага майстэрства пад кіраўніцтвам Даўжэнкі на сцэнарным факультэце інстытута кінематаграфіі ў Маскве.

*«Мяне вайна застала ў Мінску. Пад бомбавымі ўдарамі дрыжалі зямля і муры. У высокім доме над паркамі і скверамі мітусіліся птушкі. Хісталася трывожная ноч у пажарах. Сасмягла пакутная дарога, цягнучыся на Чэрвень, Беразіно і далей — па лясах, па густым, у зялёным дымку красавання жыце. Пешкам дабраўся да раз'езда Лычкоўскага — Віцебск. Там працаваў бацька; родныя верылі, што прыйду, чакалі, каб разам падацца на ўсход. Пад калёсамі зарыпеў горкі шлях выгнання. Над ім ад зары да зары віселі «гарбатыя» фокеры. Лёзна, Рудня, лясы Духаўшчыны, Дарагабуж... Ехалі, ішлі бежанцы. На запыленыя бальшакі, на матак і дзяцей, на машыны і на калгасныя статкі з-за хмар нырцавалі самалёты. У эшалон змаглі залезці аж у Вязьме. Я зразумеў, што вершы, калі ёсць патрэба, нараджаюцца, як і жыццё, усюды, нават на пуцявінах смерці».*

Навучальны 1941 год Вялюгін пачаў у Свярдлоўскім педагагічным інстытуце, а ў 1942-м, калі споўнілася васямнаццаць, апынуўся на фронце.

У БДАМЛМ захоўваецца нумар газеты «Літаратура і мастацтва» за 2 жніўня 1945 года, у якім змешчана падборка вершаў маладога Анатоля Вялюгіна, напісаных ім у часы вайны. У прадмове гаворыцца: *«Анатоль Вялюгін — малады таленавіты паэт, які пачаў друкавацца ў 1939 годзе, калі ён працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда», што ў значнай ступені абумовіла злабадзённасць і стракатасць тэматыкі ранніх яго вершаў...*

*Паэтычны талент А. Вялюгіна ўзмужнеў і вырас у часы Вялікай Айчыннай вайны. На Сталінградскім фронце, у Цюменскім ваенным шпіталі, пасля цяжкага ранення ён стварыў многа цікавых, арыгінальных вершаў і балад. Шырыня тэматыкі, яркія вобразы, свежыя, нечаканыя эпітэты і метафары характэрны для твораў паэта».*

Працытуем толькі адзін верш з той падборкі, «Хлопчык з Ленінграда», напісаны ў 1942 годзе васямнаццацігадовым Вялюгіным:

*«Заехаўшы з пазіцый*
*да сям'і сваёй,*
*Маўчыць палкоўнік*
*У кватэры над Нявой,*
*Сняжок ляціць*
*з разбітага нашчэнт вакна.*
*Забрала жонку доўгая труна.*
*Адзін сынок...*
*Ён ад блакады, ад вайны*
*Нібыта парастак*
*у склепе бульбяны.*
*— Вось хлеб...*
*(сляза на партупею*
*кап ды кап)*
*Жывога немца пакажу...*
*прывёз у штаб...*
*А сын ускінуў воч*
*блакітныя нажы:*
*— Не трэба!*
*Лепш забітага*
*мне пакажы!»*

Адчуваецца, што ў аснове напружанага, трагічнага верша — рэальны выпадак, можа, расповед знаёмага...

### Таямніцы «закрытых» рэцэнзій

Пасля вайны Вялюгін працуе ў газеце «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Полымя»... Па архіўных дакументах бачна, якім ён быў актыўным і неабыякавым. Сярод адзінак захоўвання — сцэнарыі фільмаў і рэцэнзіі, пераклады, вершы, артыкулы, фельетоны... І тэмы не самыя простыя. У фондах захоўваецца рукапіс артыкула «Том «закрытай» крытыкі», які быў надрукаваны ў «ЛіМе» 22 кастрычніка 1955 года.

*«У нашай крытыцы ёсць адзін гатунак рэцэнзій, аб якім ніколі ніхто не гаворыць. Ды і гаварыць аб ім цяжка, бо з гэтымі рэцэнзіямі знаёма вельмі вузкае кола чытачоў: дырэктар выдавецтва, галоўны рэдактар, два-тры супрацоўнікі з рэдакцыі мастацкай літаратуры і, нарэшце (праўда, не заўсёды), — сам аўтар рукапісу, што ацэньвае рэцэнзент.*

*Справа ў тым, што ва ўсіх выдавецтвах існуе правіла: кожная кніга ў час падрыхтоўкі да выдання павінна мець дзве абавязковых «унутраных», ці, як яшчэ іх называюць, «закрытых» рэцэнзіі, напісаных пазаштатнымі аўтарамі, і адну «рабочую», напісаную рэдактарам кнігі. Калі дзве «ўнутраных» будуць адмоўнымі, тады заказваецца трэцяя, а часам і чацвёртая рэцэнзіі.*

*За год у выдавецтве збіраецца велізарны том «закрытай» крытыкі. Трэба прызнацца, чытаецца ён мясцінамі як цікавы прыгодніцкі раман, — часам бывае гэтулькі, як кажуць, дыяметральна-супрацьлеглых поглядаў і думак наконт адной і той жа рэчы!*

*Я прагледзеў нядаўна такі, апошні па ліку «том», укладзены рэдакцыяй мастацкай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Амаль усе рэцэнзіі напісаны пісьменнікамі на рукапісы сваіх малодшых ці старэйшых таварышаў.»*



Анатоль Вялюгін, Еўдакія Лось, Уладзімір Караткевіч.

І Вялюгін робіць амаль неверагоднае: ён дзеліцца з чытачамі сваімі ўражаннямі ад прагляду таго «тому» «закрытых» рэцэнзій Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Асаблівасць «закрытых» рэцэнзій у тым, што неаднойчы рэцэнзенты, думаючы, што сказанае імі застанецца назаўсёды схаваным, не саромеліся ў рэзкіх ацэнках, а часам зводзілі рахункі, ці дзейнічалі з зайздрасці, дамагаючыся, каб нечая кніга не выйшла. Бо звычайна аўтару не гаварылі нават, хто быў яго рэцэнзентам. Адзначае гэта і Вялюгін: *«Тут, на маю думку, парушаецца нейкім чынам правіла нашай маралі, бо «закрытая» рэцэнзія часам бывае своеасаблівай шчылінай для нядобрасумленнага чалавека».* І прапаноўвае: якімі б ні былі тыя водгукі — з імі абавязкова павінен азнаёміцца аўтар рукапісу.

Вялюгін згадвае, што супрацоўнікі рэдакцыі мастацкай літаратуры часта ўспамінаюць як узор прынцыповасці рэцэнзію Макара Паслядовіча на кнігу Янкі Брыля «На Быстранцы». Але, на думку Вялюгіна, Паслядовіч ацэньвае рукапіс з суб'ектыўных пазіцый, «па «крытычнай інэрцыі»: *«яно (уражанне. — **А. В.**) прыблізна такое: спаткаліся старыя сябры, даўно адарваныя ад вёскі, на ўлонні прыроды, «пасудачылі» пра калгаснае жыццё за чаркай, заспакоілі, як кажуць, душу і зноў разышліся па сваіх справах».* Паслядовіч робіць выснову: «Лічу аповесць «На Быстранцы» недапрацаванай, незавершанай». Вялюгін заступаецца за твор Брыля, маўляў, аб вастрыні ўзнятых у аповесці жыццёвых пытанняў сведчыць, што твор з'явіўся ў перакладзе адразу ў двух выданнях — у ленінградскай «Звезде» і львоўскім «Жоўтні».

*«У выдавецкіх рэцэнзіях дзенідзе адчуваецца нейкая бесцырымоннасць у адносінах маладых аўтараў»,* — піша Вялюгін. Ён палічыў залішне суровым водгук Паўлюка Пранузы на рукапіс Марка Смагаровіча — рэцэнзент параіў добра прайсціся па вершах «крытычным гэблем». *«А вось пракурорскі голас Канстанціна Цітова над рукапісам баек і гумарэсак М. Скрыпкі, якія так і не ўбачылі свету: «Па праўдзе кажучы, больш слабых матэрыялаў мне чытаць не даводзілася. Трэба мець вялікую ўпартасць і настойлівасць, каб дачытаць гэты зборнік да апошняй старонкі».*

*«Вялікая адказнасць рэцэнзента і рэдактара выдавецтва. Тут, бывае, трэба наступіць на глотку ўласных густаў. Мяне здзівілі некаторыя рэдактарскія вывады Яна Скрыгана...»* — з такой прэамбулай заступаецца Вялюгін і за маладога паэта Навума Кісліка.

*«Кіслік — паэт здольны, у сваёй творчасці не заўсёды падобны да іншых, знаходзіцца ў дарозе пошукаў. Вядома, усё гэта і павінна знайсці свой адбітак у яго першай кнізе, якая заслугоўвае ўвагі, каб быць выдадзенай. Рэдактар Ян Скрыган, не спыняючыся на ідэйнай і мастацкай вартасці зборніка, піша: «Выполнена книга в манере риторики, звонкой фразы, щегольства, досадного оригинальничанья, но без глубины, без чувств и вдумчивости». Пасля кароткага разважання аб косцы, якая нібыта надае не той сэнс радкам, чытаем выснову: «Издавать же отдельной книгой считаю делом преждевременным, не вносящим вклада в поэтическую литературу». Гэта піша пісьменнік, для якога ў такім выпадку недаравальны такая катэгарычнасць і сухасць: «выполненная книга», «считаю делом преждевременным, не вносящим вклада в поэтическую литературу» — хіба ж ёсць і «прозаическая литература»?*

Тут трэба выразней абмаляваць сітуацыю... Ян Скрыган, выдатны стыліст, колішні «маладняковец», толькі вярнуўся пасля лагераў і шматгадовай высылкі, толькі пачаў шлях вяртання ў літаратуру пасля гадоў маўчання — нават сям'я, што з'явілася ў яго ў высылцы, не ведала, што ён не сціплы бухгалтар, былы зэк, а таленавіты беларускі пісьменнік. Скрыган быў прынцыповым рэдактарам, недарэмна Пятрусь Броўка менавіта яго папрасіў бязлітасна адрэдагаваць яго эпапею «Калі зліваюцца рэкі», і эпапея скарацілася, мусіць, на траціну... А Анатолю Вялюгіну трыццаць адзін год, праблемы маладых аўтараў яму добра знаёмыя і блізкія... І ён смела выступае ў іх абарону.

Заканчваецца артыкул згадкай пра грунтоўную рэцэнзію Рыгора Шкрабы на раман Аляксея Кулакоўскага «Расстаемся не надоўга», у канцы якой дапіска «Усе заўвагі ўлічаны. А. Кулакоўскі, аўтар». Вялюгін піша: «Добра было б, каб такія дапіскі сталі ў канцы кожнай выдавецкай рэцэнзіі».

### Бітва за «Белую вясёлку»

Анатоль Вялюгін разважаў з веданнем справы, бо і сам быў аўтарам такіх «закрытых» рэцэнзій. У БДАМЛіМ мне пашчасціла знайсці адну з іх, напісаную па замове Белдзяржвыдавецтва, на першы паэтычны зборнік маладога аўтара Уладзіміра Караткевіча. Прадстаўлены ўвесь абавязковы «камплект», пра які піша Анатоль Вялюгін у сваім артыкуле: дзве «закрытыя» рэцэнзіі і заключэнне рэдактара выдавецтва. Рэцэнзентамі выступілі Рыгор Бярозкін і Анатоль Вялюгін, рэдактар — Антон Бялевіч.

Назва ж, пад якой Караткевіч здаў у выдавецтва свой першы зборнік, падасца нечаканай і нязвыклай: «Белая вясёлка».

Дык вось, не ведаю, ці чытаў Рыгор Бярозкін, колішні аднакурснік Анатоля Вялюгіна па педінстытуце, артыкул таго пра «закрытыя» рэцэнзіі, але як назнарок прамаўляе менавіта тым пракурорскім тонам, які крытыкаваў Вялюгін. Хоць пачынае з таго, што ў асобе Караткевіча «маем бясспрэчна таленавітага паэта з добрым (у асноўным) густам». Бярозкін адзначае ўдалыя вершы, сярод якіх класічны сёння твор «Заяц варыць піва». А потым пачынаюцца чатыры старонкі заўваг.

*«1. Ул. Караткевічу, як паэту, бракуе рэзкай акрэсленасці грамадска-палітычнай пазіцыі».*

Бярозкін папікае аўтара, што ў зборніку вершы на «звярыныя» і «птушыныя» сюжэты *«амаль зусім выціснулі творы на сучасную тэму, на тэму актыўнай грамадскай практыкі людзей-суайчыннікаў паэта»*, што, на думку рэцэнзента, сведчыць «аб відавочнай аднаба-

ковасці аўтара кнігі «Белая вясёлка». Асабліва Бярозкін абрываецца на верш «Вадарод», якім адкрываецца зборнік: *«У ім гарачая фантазія паэта намалявала даволі выразную карціну катастрофы, якую нясе з сабой вадарод у руках сучасных варвараў-імперыялістаў, але, на жаль, у вершы няма гневу і абурэння, накіраваных па адрасу гэтых варвараў — падпальшчыкаў новай вайны. Атрымаўся верш хутчэй пацыфічны, чым антымілітарыстычны».*

*«2. Ул. Караткевічу трэба павесці рашучую барацьбу з уплывамі «кніжнай», «літаратурнай» паэзіі».*

Рыгору Бярозкіну не падабаюцца выразы тыпу «мук маіх юдоль», «распятая на крыжы варона», якая «выкупіла грэх усіх варон», «багавіння струны», «бурштыновы сон» і г. д. Абурае рэцэнзента верш «Каханая» *(«Жылі, уступалі ў шлюб, нашчадкаў мелі, Хадзілі з імі на бульвар гуляць, А паміраць ад шчасця не ўмелі, бо для кахання трэба богам стаць»).*

«**Правінцыяльны дэманізм**!» — ставіць дыягназ Рыгор Бярозкін. — *«Ёсць у гэтых радках, акрамя ўсяго іншага, непрыемная нота пагардлівага стаўлення да звычайных смяротных, якія ніяк не могуць стаць «багамі» і «паміраць ад шчасця», як гэта ўмеюць асобныя абраннікі. Нельга так — бесчалавечна, ставячы сябе ў позу «арыстакрата духа», — пісаць аб другім чалавеку, якому, відаць, больш пашанцавала ў каханні:*

*А дзяўчына*
*з вачыма блакітнымі,*
*Суседу, дурному, як бот,*
*Абдуванчык тыцнула спрытна*
*У шырокі, як ступа, рот».*

Рэцэнзент, на жаль, не прачытаў іроніі і самаіроніі ў гэтых радках — а гэта ж Караткевіч уласны аўтапартрэт выпісваў, — і пачынае заступацца за героя, якога аўтар чамусьці абзывае дурным, як бот, ды яшчэ рот яго крытыкуе. А Караткевіч, як відома, часта іранізаваў над уласнай знешнасцю («рот, як шчыліна ў паштовай скрыні»).

Не разумее Бярозкін, і як гэта паэт побач з «дурны, як бот» ставіць «Шуберт падзяляе ціхі сум» — а Караткевіч менавіта такімі кантраснымі іранічнымі спалучэннямі прафаннага і ўзвышанага і прыкрашаў стыль.

*«Вывад: «Кніжная поза вельмі шкодзіць здольнаму паэту Караткевічу, яе трэба пераадолець самым рашучым чынам, бязлітасна і неадкладна».*

Дзякуй богу, Караткевіч не ўзяўся за тое бязлітаснае пераадольванне...

Сярод іншых закідаў — забагата выпадковых, на думку крытыка, вобразаў («акіян аўса», «рампа з светлякоў»). Зноў жа — неразуменне крытыкам іранічнага падтэксту ў радку «Пяць дзяцей, кружок маленькіх лодыраў» (чаму гэта савецкія дзеці названыя лодырамі?)

І апошні пункт — зрабіць кнігу больш цэльнай.

*«Варта было б таксама падумаць і аб назве для кнігі. «Белая вясёлка» — назва, на мой погляд, няўдалая».* Бярозкін завяршае рэцэнзію высновай, што зборнік выдаваць трэба, але сур'ёзна над ім папрацаваўшы.

Дата, якая стаіць у канцы, — 15 ліпеня 1957 г.

Закрытая рэцэнзія Анатоля Вялюгіна на зборнік «Белая вясёлка» займае ўсяго паўтары старонкі, таму цытуем яе цалкам:

*«Да гэтай кніжкі нельга ставіцца так, як звычайна ў нас разглядаюць першы зборнік маладога аўтара. Зборнік Уладзіміра Караткевіча сведчыць аб спеласці і арыгінальным таленце паэта. Таму скажу адразу: кніжку абавязкова трэба выдаць.*

*Уладзімір Караткевіч зусім нядаўна выступіў у нашых перыядычных літаратурных выданнях, яго вершы звярнулі на сябе ўвагу чытача, на многія з іх з'явіліся рэцэнзіі ў друку і, гаворачы сёння пра дзень нашай паэзіі, нельга абысці маўчаннем творчасць Уладзіміра Караткевіча.*

*У паэта сваё, як і ў кожнага мастака, бачанне свету, вобразы — арыгінальныя, свежыя, ужо цяпер, маючы перад вачыма толькі што сабраную невялічкую кніжку, заўсёды можна адрозніць голас Караткевіча ў вялікім хоры сучаснай беларускай паэзіі.*

*Уладзімір Караткевіч ідзе ў паэзію няходжанымі сцежкамі, якімі заўсёды ходзяць сапраўдныя мастакі.*




*Шырокі і багаты яго паэтычны свет. Спеласцю думкі вызначаецца верш на самую, як кажуць, надзённую тэму — «Вадарод», — аб вадароднай бомбе. Багата вершаў прысвечана Савецкай радзіме, Савецкай Беларусі, цудоўна паэт расказвае аб харастве роднай прыроды. Цікава зроблены вершы аб каханні і маладзі, аб чысціні і велічы гэтага пачуцця.*

*У зборніку ёсць творы на гістарычныя тэмы — «Машэка», «Балада пра паўстанца Ваўкалаку» і іншыя. Гэта бадай што лепшыя вершы зборніка, яны таксама вызначаюцца спеласцю і мастацкай і палітычнай думкі аўтара.*

*Белая вясёлка звычайна бывае пасля дажджу ў туманнае ранне на пачатку пагоднага дня. Я ўпэўнены, што неўзабаве наступіць гэты дзень і ў творчасці паэта, і яго талент сапраўды заззяе ўсімі фарбамі жыцця.*

*Зборнік «Белая вясёлка» ўсё гэта абяцае».*

Вялюгін дапісвае ад рукі дзве заўвагі:

*«1) Варта даць да зборніка невялічкую (на адну старонку) прадмову сталага паэта.*

*2) Кніжка плануецца на 1958. Рэдактару перад здачай у набор трэба ўзяць у аўтара новыя рэчы».*

Дата напісання, якая стаіць пад рэцэнзіяй, роўна на два месяцы ранейшая за тую, што пазначае рэцэнзію Рыгора Бярозкіна: 15 мая 1957 г. Вось такая цікавая акалічнасць. Каб не гэта — можна было падумаць, што Вялюгін на пунктах абараняе Караткевіча ад заўваг Бярозкіна, але, магчыма, было наадварот. Хоць па правілах рэцэнзенту не павінны былі даваць чытаць водгук другога крытыка, каб меркаванне засталося незалежным, аднак у абодвух тэкстах зашмат супадзенняў з супрацьлеглымі высновамі. Нібыта Бярозкін хоча аргументавана абвергнуць ухвалы Вялюгіна. Хто ведае, каб іх рэцэнзія была першай па часе, чым вялюгінская, з падкрэсленым «абавязкова трэба выдаць», ці не было б высновай — рана зборнік, хай аўтар яшчэ творча падрасце?

Заключэнне рэдактара Антона Бялевіча, якое захоўваецца ў фондах БДАМЛМ, напісана ад рукі і займае дзве старонкі. У самім загалоўку рэцэнзіі ўжо значыцца іншая назва зборніка — Караткевіч прыслухаўся да заўваг і замест «Белай вясёлкі» назваў кнігу «Матчына душа», пад якой яна і засталася ў гісторыі.

Вось што піша Бялевіч, дыпламатычна выкарыстоўваючы пасылы і аднаго, і другога аўтара «закрытых» рэцэнзій:

*«Пры здачы аўтарам рукапісу ў выдавецтва, умоўна кніга была названа «Белая вясёлка», куды было ўключана 46 вершаў і паэма «Перакаці-поле». Дапрацоўваючы разам з аўтарам рукапіс, мы знайшлі мэтазгодным зняць з кнігі слабую паэму «Перакаці-поле» і апавяданне ў вершах «Веларыкша». Гэтыя творы расцягнутыя, празаічныя. Апрача гэтага, з кнігі знята яшчэ 14 вершаў, якія нават пры далейшай нашай дапрацоўцы засталіся не зусім дасканалымі, невыразнымі па сваёй задуме. І такім чынам, у кнізе «Матчына душа» засталося 32 вершы. Трэба сказаць, што і многія з гэтых вершаў дапрацоўваліся, удасканальваліся. Справа ў тым, што ў Караткевіча, у вельмі таленавітага паэта, яшчэ не ўсё ў парадку з мовай. У яго творах адчуваецца налёт літаратуршчыны, уплыў «кніжнай» паэзіі. Мясцінамі творы бываюць зацягнутымі і трошкі манернымі. Вось чаму ў сілу сваіх магчымасцяў мы стараліся выціснуць з вершаў умоўную «прыгажосць» слова, вычурнага, штучнага вобраза. Верш зрабіўся больш скандасаваным, і прасцейшым. Многа хараства прыроды, хараства і шчырасці людской у творах Уладзіміра Караткевіча. Шырокі і багаты яго паэтычны свет. Нельга не адзначыць такіх цудоўных вершаў гэтай кнігі, як «Машэка», «Балада пра паўстанца Ваўкалаку», «Сырцовыя цагліны», «Заяц варыць піва»... Многа дабавіў аўтар вершаў пра нашых сучаснікаў, пра радзіму, пра свой родны край. З вялікім пачуццём, вельмі сардэчна піша паэт пра каханне, пра добрыя сэрцы нашых людзей.*

*Вывад: першы зборнік вершаў Уладзіміра Караткевіча трэба абавязкова выдаць. Ён з вялікай цікавасцю будзе сустрэчан нашым чытачом. У асобе Уладзіміра Караткевіча мы маем таленавітага паэта. Аб гэтым сведчыць яго кніга «Матчына душа».*

*А. Бялевіч».*

Першы зборнік Караткевіча пабачыў свет у 1958 годзе. Там сапраўды дададзена, як раіў Вялюгін, шмат новых вершаў, датаваных тым жа 1958 годам. Даследчык Пятро Жаўняровіч знайшоў у нататніках Караткевіча аркуш з варыянтамі назваў кнігі, там значацца «Белая вясёлка», «Павяртанне на Радзіму» і «Матчына душа»... Канчатковая назва магла з'явіцца ці замацавацца невыпадкова. Справа ў тым, што першым сур'ёзным мастацкім творам Анатоля Вялюгіна лічыцца яго верш «Матчына песня», які ў 1938-м, за дваццаць гадоў да выхаду першай кнігі Караткевіча, быў надрукаваны ў часопісе «Полымя рэвалюцыі». Ці не падказаў Вялюгін паэту назву зборніка, альбо ці не дапамог выбраць з некалькіх варыянтаў менавіта сугучную ўласнай назве?

А 26 красавіка 1957 года Анатоль Вялюгін даў Уладзіміру Караткевічу рэкамендацыю для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў БССР.

Шмат таямніц яшчэ захоўваюць архівы... І датычна Анатоля Вялюгіна ёсць яшчэ цікавыя знаходкі, пра якія пагаворым пасля. А пакуль найлепшай памяццю для паэта будзе пачытаць яго вершы.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Прэм'ера

# Ціхія досвіткі на купалаўскай сцэне

## Чым здзіўляў гледачоў спектакль па вядомым сюжэце

**Прэм'ера спектакля «А досвіткі тут ціхія» прайшла ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. За аснову быў узяты аднайменны твор Барыса Васільева. Здаецца, усе ведаюць сюжэт пра старшыну Фядота Васкова і ўзвод дзяўчат-зенітчыц яшчэ са школьных гадоў. Аднак, як вядома, кожны рэжысёр бачыць матэрыял па-свойму. Дык як жа яго інтэрпрэтаваў расійскі пастаноўшчык Дзмітрый Акімаў?**



— У наступным годзе юбілей Барыса Васільева, і, натуральна, мы хацелі наблізіцца да аўтара, каб яго думкі, яго пасылы максімальна дакладна рэтрансляваць праз сцэнічную прастору, — распавядае рэжысёр.

Атрымалася гэта добра настольскі, наколькі дазваляе тэатральная сцэна. Мастак-пастаноўшчык Аляксандр Камянец і мастак па святле Аляксандр Разанцаў добра папрацавалі над тым, каб пагрузіць гледача ў атмасферу спектакля. Памятаеце эпізод, дзе Васкоў тэлефануе таварышу Трэцяму, каб паведаміць аб тым, што немцы ў лесе? Гэта вельмі цікава абыгралі на тэатральнай сцэне, дакладней, не толькі на ёй, але і ў глядзельнай зале. Вось ён, старшына Васкоў, у асяроддзі ўсхваляваных дзяўчат паведамляе трывожныя навіны. А вось таварыш Трэці павольна з'яўляецца ў тэатральнай ложы і часам з'едліва адказвае Васкову. Розныя лакацыі былі падзелены таксама і светлавым афармленнем. Уражвае і тое, што дэкарацыя рачнога берага была залітая сапраўднай вадой. Згадзіцеся, калі старшына мые твар, не іграючы, а наўзапраўду — гэта ж зусім іншыя ўражанні. Цэнтральнай жа дэкарацыяй спектакля была вялікая драўляная брама, якая быццам бы падзяляла жыццё герояў на да і пасля. Звычайныя дзяўчаты, чые лёсы зламала вайна, сутыкнуўшыся з ворагам, знаходзяць у сабе сілы для подзвігу.

Пастаноўка доўжыцца тры гадзіны з антрактам, аднак **рэжысёр Дзмітрый АКІМАЎ** запэўнівае, што глядач дакладна не засумуе.

— Спектакль вельмі фрагментарны, ёсць дынаміка і актыўная змена кадраў, — распавядае ён. — Для мяне ён «пралятае». Асабліва другі акт, хоць па таймінгу такі ж, як і першы. Ды і ўвогуле, усё ж часам хочацца, каб людзі спыніліся і падумалі пра нейкія важныя рэчы. Мне здаецца, для тэмы, якая раскрываецца ў гэтым спектаклі, не патрэбны спех. Усё ж гэта памяць, гэта вельмі важныя рэчы, на якія трэба настроіць сваю душу.



Таксама Дзмітрый Акімаў адзначае, што не хвалюецца аб тым, што яго твор будуць параўноўваць з савецкай кінакарцінай Станіслава Растоцкага:

— Гэты ціск знікае за кошт таго, што наш тэкст на беларускай мове. Вядома, выбітны фільм Растоцкага ва ўсіх перад вачыма, але мы паспрабавалі зрабіць нешта сваё. І, мне здаецца, не гледзячы на тое што матэрыял даволі кінематаграфічны, у нас атрымалася перанесці яго на сцэну.

Варта адзначыць, што гэта першы досвед працы Дзмітрыя Акімава ў Беларусі ў такім вось фармаце. Кастынг пачаўся яшчэ ў верасні. Па словах рэжысёра, усё прайшло дастаткова лёгка. Ён размаўляў з кожным артыстам індывідуальна па чарзе, і пасля гэтага ўжо было дакладнае разуменне, хто каго будзе іграць. Напрыклад, на прэм'ерным паказе Васкова іграў Сяргей Бірульчык, Асяніну — Таццяна Гулевіч, а Камялькову — Ганна Мешчаракова. Трэба адзначыць, што акрамя маладых артыстаў у гэтым спектаклі таксама ўдзельнічалі такія легенды тэатра, як Генадзь Аўсяннікаў і Зінаіда Зубкова.

Што датычыцца асаблівасцяў беларускай мовы, то з гэтым у рэжысёра таксама не ўзнікла складанасцяў. Пры падрыхтоўцы да спектакля ён спачатку карыстаўся перакладам, а потым ужо і без яго выдатна разумеў, хто што гаворыць, і ўносіў тыя ці іншыя праўкі.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

Нябеснае і зямное

# СВЯТЛО БАГАРОДЗІЦЫ

## Выстава праваслаўных ікон «Заступніца руплівая» зладжана ў музеі «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» ў Брэсце

**На выставе, якую склалі абразы Божай Маці, у філіяле Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» прадстаўлена больш за 150 экспанатаў. Гэта праваслаўныя іконы XVII — пачатку XXI стагоддзя з фондаў абласнога краязнаўчага музея, ёсць яшчэ абразы з рызніц Свята-Сімяонаўскага кафедральнага сабора, манастыра Раства Святой Багародзіцы, Маларыцкага храма Мікалая Цудатворца, а таксама з прыватнай калекцыі.**



Абраз «Раство Багародзіцы», які спрабавалі вывезці за мяжу распілаваным на дзве часткі.

Як сказала куратар выставы, **вядучы навуковы супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея Алена КУПРЫЯНЮК,** выстава стала своеасаблівым падарункам брастаўчанам і гасцям горада да свят: «Хацелася прыцягнуць увагу людзей да свята, дабра, любові, якія і ўвасабляе сабой Багародзіца. У экспазіцыі сярод іншых прадстаўлены рэдкія і вельмі рэдкія абразы, створаныя ў розны час рознымі майстрамі, але ўсе экспанаты аб'ядноўвае тое, што яны здольны закрануць самыя патаемныя струны душы чалавека, настроіць на ўспрыняцце духоўнага, узвышанага, падараваць надзею».

Назвай экспазіцыі сталі першыя словы трапара Казанскай іконе Божай Маці. Яна сапраўды заступніца руплівая за ўсіх людзей. Таму стагоддзямі моляцца Багародзіцы, просяць міласці і заступніцтва.

Выстава ўмоўна падзелена на некалькі раздзелаў. Першы прысвечаны зямному жыццю Прасвятой Багародзіцы. Шэраг ікон з увасабленнем двунадзясятых свят заканчваецца абразом «Успенне Прасвятой Багародзіцы». У другім раздзеле змешчаны багародзічныя вобразы — як асноўныя іканаграфічныя тыпы, так і больш позняя іканаграфія. Трэці раздзел прысвечаны гімнаграфіі Багародзіцы, дзе прадстаўлены так званыя акафістныя іконы. Напрыклад, абраз вельмі рэдкай іканаграфіі «Дастойна ёсць».

— Выстава стала вынікам намаганняў як навуковых работнікаў, так і рэстаўратараў, — расказала далей яе куратар. — Гэта вельмі цікавая работа. У кожнага з абразоў сваё жыццё, свая гісторыя, часам вельмі цікавая, захапляльная, на мяжы дэтэктыўнага сюжэту. Напрыклад, абраз «Раство Багародзіцы» музею ў 1981 годзе перадала Брэсцкая мытня. Але быў ён далёка не такім, якім зараз бачаць наведвальнікі выставы. Абраз спрабавалі вывезці за мяжу распілаваным на дзве часткі. Да таго ж, кожную з частак цесна заматалі ліпкай стужкай, яшчэ больш агрэсіўнай за цяперашні скотч. Напачатку здавалася, што надзеі на аднаўленне мала. Але ж рэстаўратары зрабілі ўсё магчымае для выратавання «Раства». Яны змаглі аднавіць драўляную аснову і лакафарбавы слой. І сёння мы маем магчымасць убачыць абраз, напісаны ў 1914 годзе. Праўда, ледзьве прыкметная лінія распілу нагадвае пра няпросты лёс святыні.



Свая гісторыя ў абраза «Боская Маці Адзігітрыя» з царквы Раства Прасвятой Багародзіцы вёскі Шчэбрын Брэсцкага раёна. Гэты абраз можна лічыць сведчаннем барацьбы савецкай дзяржавы з рэлігіяй, якая вылілася ў закрыццё храмаў. Царкву ў названай вёсцы, як і ў многіх населеных пунктах тады, закрылі. На шчасце, у некага хапіла свядомасці не выкінуць стары абраз, а здаць яго ў музей. І хоць паступіў ён сюды ў сярэдзіне 1970-х гадоў у даволі гаротным выглядзе, рэстаўратары ўзяліся за работу. А калі падключыліся навукоўцы, то ўсе разам высветлілі, што абраз напісаны ў 1661 годзе. І такіх, намоленых стагоддзямі, ікон на выставе нямала.

Большасць абразоў створана ў розны час у Расіі. Ёсць напісаныя сучаснымі беларускімі іканапісцамі, ёсць тыя, што прадстаўляюць палескую школу. Несумненна, зацікавіць наведвальнікаў сучаснае ўвасабленне самага старадаўняга багародзічнага вобраза Беларусі — Купяціцкай іконы Божай Маці.

Выстава прадоўжыцца да сярэдзіны сакавіка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# ЗА МЕЖАМІ ТРОХМЕРНАЙ ПРАСТОРЫ

## Якую рэальнасць бачаць гродзенскія мастакі ў калядных сюжэтах

**Экспазіцыя, якая прадстаўлена ў выставачнай зале Гродзенскага гарадскога цэнтра культуры, стала заключным акордам чарговага года і традыцыйна праходзіць у каляднай тэматыцы. Сёлета тут сабрана больш за паўсотні работ гродзенскіх творцаў — мастакоў, дызайнераў, скульптараў. Усе экспанаты маюць розныя тэхнікі выканання, але аб'яднаны духоўнай радасцю існавання чалавека ў свеце.**

Выстаўка так і называецца — «На Каляды». Як аказалася, тэматыка настолькі багатая, што амаль кожны год па ёй ёсць што прадставіць. Да экспазіцыі далучаюцца новыя аўтары, пішуцца новыя работы. Вось і сёлета на выстаўцы нямала маладых мастакоў — Юлія Самойла, Ягор Коткін, Вольга Бухаўка, Наталля Ляліна... Некалькі новых работ прадставілі вядомыя мастакі — Пётр Янушкевіч, Уладзімір Качан, Вікторыя Ільіна.

**Мастацтвазнаўца Марына ЗАГІДУЛІНА** так характарызуе агульны настрой экспазіцыі: святочная каларыстыка, зззянне сонца, агню і цяпла. А ўсё таму, што Каляды нясуць у сабе гэты невычарпальны духоўны сэнс, які выклікае філасофскія разважанні пра ўсеагульную гармонію ў прыродзе і ў душы. А шматлікія выявы анёлаў нібы ахінаюць сваёй апекай і абараняюць ад нядобрых сіл.

— Кожны аўтар па-свойму бачыць тэму Каляд. У кагосьці яна адлюстравана праз навакольнае асяроддзе. Хтосьці праз пейзажы стварае зімовы настрой, іншыя аўтары пераходзяць да асэнсавання ўсяго сусвету. Многія звяртаюцца да багатай біблейскай тэматыкі. Бо, як вядома, народнае свята Каляды звязана з Нараджэннем Хрыстовым, — зазначае мастацтвазнаўца.



Менавіта да біблейскіх матываў звярнуўся і **старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў Уладзімір КАЧАН**. На выстаўцы прадстаўлены дзве яго карціны на гэту тэму. Як расказаў сам аўтар, адна яго работа паказвае земное жыццё Хрыста да яго смерці на крыжы. Светлая палоска на карціне — гэта вучэнне, якое ён пасля сябе пакінуў.

На выстаўцы прадстаўлена і зусім новая работа мастака, сэнс якой пачэрпнуты з Евангелля. Як патлумачыў аўтар, яе сутнасць у духоўным бачанні свету, а не толькі ў матэрыяльным. Нараджэнне Хрыста — з'ява сусветнага, касмічнага маштабу, адсюль і залітая святлом постаць Марыі ў бязмежнай прасторы.

Аб чым думае аўтар, калі стварае падобны сюжэт?

— У мяне ёсць рамяство, якое дазваляе гэта адлюстраваць, — тлумачыць канцэпцыю сваёй творчасці Уладзімір Качан. — Мне важна паказаць духоўнасць праз матэрыяльную рэальнасць.



Гэта даволі складана ва ўсе часы. Хоць да гэтай тэмы ў мастацтве пачалі звяртацца яшчэ ў сёмым стагоддзі. Тэма Хрыстова Нараджэння была адной з самых распаўсюджаных, бо несла ідэю нараджэння новага свету, надзей, добрых спадзяванняў. Многае з тых часоў удаканальваецца, калі можна так сказаць. Наш час дазваляе паказаць гэту тэму ў тонкім свеце, бо глядач стаў больш адукаваны і можа яе ўсвядоміць. Гэта выхад за межы нашай трохмернай прасторы.

**Мастак Сяргей УТКІН** бачыць увасабленне каляднай тэмы ў вобразе суседства чалавека і ката. Карціна таксама напісана да сёлетняй выстаўкі і стварае настрой утульнасці і цяпла. За вокнамі мяце зімовая завея, а чалавек з катом пазірае на яе праз акно, у пакоі гарыць святло, і яму з катом нічога не пагражае...

— Безумоўна, калядная тэматыка пашыраецца, нешта мяняецца ў вобразах, формах, штрыхах. Але галоўны пасыл застаецца нязменным — стварыць мір і пакой у душы чалавека, даць яму надзею на перамогу дабра. Гэты пасыл застанецца назаўсёды, бо ў ім галоўная сутнасць існавання чалавека, яго ўчынкаў. Мастакі заўсёды будуць звяртацца да гэтай невычэрпнай тэмы. І наша выстаўка — таму прыклад, — лічыць мастак.

Калядная тэматыка зацікавіла і сына Сяргея Уткіна Андрэя. Ён лічыць, што экспазіцыя стварае адпаведны настрой, многія работы маюць глыбокі філасофскі сэнс.

— Калі браць біблейскую тэматыку, яе можна адлюстраваць павярхоўна, а можна больш паглыблена. Тым не менш там заўсёды будзе філасофскі кантэкст, кожны мастак раскрывае яго пасвойму. Работы філасофскага плана ўтойваюць у сабе сюжэты, якія прапісваюцца ў свядомасці гледачоў. Задача мастака — раскрыць нейкія тонкія рэчы, складаныя, — упэўнены Андрэй.

Хлопец таксама мастак, пачынаў маляваць маслам, зараз зацікавіўся камп'ютарнай графікай, робіць калажы, эксперыментуе. Між тым ён упэўнены, што сапраўднаму мастацтву ніякія нейрасеткі не пагражаюць. Яны не заменяць мастака, бо самае важнае — гэта ідэі. Толькі чалавек уносіць у творчасць нешта новае, расказвае аб звыклых рэчах па-іншаму, праграма сама гэтага зрабіць не можа.

— Мастацтва — гэта заўсёды сустрэча з нечым патаемным. Яно дапамагае лепш зразумець сябе, а значыць, знайсці адказы на важныя пытанні, узбагаціць унутраны свет чалавека. Асабліва гэта робяць такія жыццёсцвярджальныя калядныя сюжэты, — рэзюмуе Андрэй.

Адно ў яго пажаданне — каб аўтараў на выстаўцы было яшчэ больш, бо патэнцыял гродзенскіх мастакоў у гэтым сэнсе даволі значны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# ТРЫВОЖНЫ ПАЎВОСТРАЎ

## Абвастраецца супрацьстаянне паміж КНДР і Паўднёвай Карэяй



**Рызыкі прамога сутыкнення ўзброеных сіл КНДР і Рэспублікі Карэя ў 2024 годзе найбольш высокія. З такой ацэнкай выступіла Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва Карэі (ЦТАК), паведаміла ТАСС.**

Агенцтва назвала «самазабойчым бясчынствам» некалькі вучэнняў паўднёвакарэйскіх ваенных у 2024 годзе і заявы кіраўніцтва Рэспублікі Карэя аб умацаванні ваеннага патэнцыялу. «Па просьбах і пры актыўным супрацоўніцтве марыянетак яшчэ больш інтэрвентаў, у першую чаргу з ЗША і Японіі, будуць блукаць па Карэйскім паўвостраве, яны праводзяць беспрэцэдэнтную па маштабе правакацыйную палітыку ў ваеннай сферы, якая ўключае ядзерны ўдар. У сувязі з гэтым сёлета рызыкі сутыкненняў найбольш высокія», — адзначаецца ў каментарыі ЦТАК.

Трэба мабілізаваць самыя магутныя сродкі, каб знішчыць ЗША і Паўднёвую Карэю, калі яны абяруць шлях ваеннай канфрантацыі супраць Паўночнай Карэі, раней заявіў лідар КНДР на сустрэчы з камандзірамі Карэйскай народнай арміі. Кім Чэн Ын адзначыў, што небяспека ўзброенага канфлікту на Карэйскім паўвостраве становіцца рэальнай з-за «варожых манеўраў» з боку сапернікаў. «Калі вораг выбера шлях ваеннай канфрантацыі, наша армія павінна нанесці смяротны ўдар, каб цалкам знішчыць яго, мабілізаваўшы ўсе самыя цвёрдыя сродкі і магчымасці без найменшых ваганняў», — заявіў лідар КНДР (цытата па Reuters).

Кім Чэн Ын 28 снежня загадаў арміі і ваеннай прамысловасці актывізаваць намаганні па падрыхтоўцы да магчымай вайны. Паводле яго слоў, уз'яднанне з Паўднёвай Карэяй немагчыма, паколькі тая «выбрала сваёй нацыянальнай палітыкай «уз'яднанне шляхам паглынання» і «аб'яднанне сістэмы», што рэзка кантрастуе з лініяй нацыянальнага ўз'яднання, заснаванай на прынцыпе «адна нацыя, адна дзяржава і дзве сістэмы», якой прытрымліваецца Паўночная Карэя.

ЗША і Паўднёвая Карэя нарошчваюць супрацоўніцтва ў галіне ядзернага стрымлівання КНДР на фоне частых ракетных выпрабаванняў і запуску яе першага ваеннага спадарожніка-разведчыка «Манрыген-1» у лістападзе. У снежні Вашынгтон, Сеул і Токіа правялі вучэнні з прыцягненнем амерыканскага стратэгічнага бамбардзіроўшчыка B-1B.

У сувязі з запускам КНДР разведвальнага спадарожніка Паўднёвая Карэя часткова прыпыніла дзеянне пагаднення аб зніжэнні напружанасці ў ваеннай сферы з Пхеньянам ад 19 верасня 2018 года. У адказ Паўночная Карэя скасавала гэтае пагадненне, абвінаваціўшы суседнюю краіну ў «наўмысных і правакацыйных манеўрах», якія давялі сітуацыю да «некантралявальнай».

Першыя ў 2024 годзе артылерыйскія вучэнні паўднёвакарэйскае войска правяло ўжо 1 студзеня. На наступны дзень артылерыйскія вучэнні паўтарыліся. 3 студзеня ваенна-марскія сілы Рэспублікі Карэя правялі манеўры з баявымі стрэльбамі і ўдзелам 13 караблёў у Жоўтым, Японскім морах і ў водах на поўдзень ад Карэйскага паўвострава. 29 снежня пачаліся сумесныя вучэнні Рэспублікі Карэя і ЗША ў мясцовасці побач з горадам Пхачхон, яны працягнуліся да 5 студзеня.

Як адзначыла агенцтва ЦТАК, Паўднёвая Карэя пачала 2024 год «гулам гармат» і «канфрантацыйным трызненнем», гэта сведчыць аб тым, што міру і стабільнасці на Карэйскім паўвостраве не будзе, калі пакінуць без адказу «безразважлівасць марыянетак». «Гэта выродлівая зграя шалёных сабак — усяго толькі дакладны перадавы атрад амерыканцаў, іх гарматнае мяса. І чым яны буйнейшыя, тым хутчэй іх адпраўяць на бойню. Аматараў канфрантацыі ў новым годзе чакаюць настолькі пакутлівыя моманты, што яны і ўявіць не могуць», — папярэдзілі аўтары каментарыю.

## Аргенцінскі суд заблакіраваў частку рэформаў прэзідэнта краіны

**Суд у Аргенціне прыпыніў дзеянне часткі мераў надзвычайнага ўказа прэзідэнта Хаўера Мілея, якая датычыцца змен працоўнага заканадаўства. У заяве суда гаворыцца, што гэта зроблена для ўдакладнення, ці мае прэзідэнт права імплементаваць гэтыя меры без ухвалення Кангрэса.**



Скаргі на рэформы падаў найбуйнейшы ў краіне прафсаюз CGT, які прызначыў на 24 студзеня агульнанацыянальную забастоўку. Падпісаны прэзідэнтам 20 снежня «мега-ўказ», у прыватнасці, накладваў абмежаванні на правядзенне забастовак у некаторых сектарах, у тым ліку ў сферы транспарту, адукацыі, аховы здароўя і сувязі. Дакумент таксама даў работадаўцам магчымасць павялічыць максімальны выпрабавальны тэрмін з трох да васьмі месяцаў.

Указ можа быць таксама адхілены Кангрэсам, дзе ў партыі кіраўніка дзяржавы няма большасці ні ў верхняй, ні ў ніжняй палаце. Мілей уступіў на пасаду прэзідэнта Аргенціны 10 снежня. У сваёй першай прамове ў якасці кіраўніка дзяржавы ён ахарактарызаваў сітуацыю ў краіне як крытычную і заявіў аб неабходнасці шокавых мер у эканоміцы. «Перад тым, як сітуацыя пачне паляпшацца, яна пагоршыцца», — заявіў Мілей.

Неўзабаве пасля ўступлення на пасаду яго адміністрацыя дэвальвавала аргенцінскі песа больш чым на 50 працэнтаў і абвясціла аб значным скарачэнні шчодрых дзяржаўных субсідый на паліва і транспарт. Мілей таксама аб'явіў аб спыненні ўсіх новых праектаў грамадскага будаўніцтва і аб прыпыненні на год дзяржаўнай рэкламы.

20 снежня ён выступіў са зваротам да нацыі, у якім абвясціў аб падпісанні надзвычайнага ўказа, і пералічыў 30 асноўных рэформаў, у якія ўвайшлі адмова ад рэгулявання цэн, рэформа мытных правілаў для палягчэння міжнароднага гандлю, падрыхтоўка да прыватызацыі дзяржаўных кампаній і забарона на ўвядзенне абмежаванняў на экспарт. Прапанаваныя меры неадкладна выклікалі масавыя пратэсты ў краіне, дзе, паводле ацэнак, каля 40 працэнтаў насельніцтва жыве за рысай беднасці.

Паводле даных нацыянальнага інстытута статыстыкі, у лістападзе гадавая інфляцыя ў Аргенціне склала 160 працэнтаў. Дэфіцыт бюджэту ацэньваецца ў 5,2 працэнта ВУП. Адной з праблем застаюцца высокія цэны на энергарэсурсы, якія імпартуюцца. Адток капіталу і зніжэнне даходаў ад экспарту прывялі да росту дзярждоўгу. Паводле звестак МВФ, да канца мінулага года ён складаў каля 90 працэнтаў ВУП.

## Цэны на атэлі ў Парыжы ўзраслі ўтрая

**Уладальнікі гасцініц спрабуюць атрымаць максімум з сітуацыі. Пра гэта гаворыцца ў даследаванні, праведзеным асацыяцыяй па абароне правоў спажыўцоў UFC-Que Choisir, паведаміў Euronews. Эксперты сцвярджаюць, што па меры набліжэння Алімпіяды рост цэн працягнецца і цалкам здольны дасягнуць 500 працэнтаў.**



Нават самыя сціплыя атэлі ў французскай сталіцы сёння не па кішэні шматлікім турыстам. «Мы рады, што прыехалі ў Парыж цяпер, таму што падчас Алімпіяды мы дакладна не прыедзем», — заўважыла адна з турыстак. Другая вандроўніца таксама адзначыла, што не прыедзе на Алімпіяду, «таму што цэны занадта высокія».

Уладальніца атэля Hotel du Muguet Шарлін Пелецье заявіла, што павінна падняць цэны, каб падцягнуцца за канкурэнтамі. «Гэта выключнае мерапрыемства, так што мы стараемся атрымаць з яго максімум», — заявіла Пелецье. Каб абмежаваць чаканы масавы рост цэн падчас Гульняў, французскія ўлады праводзяць праверку 10 тысяч гасцініц і рэстаранаў па ўсёй краіне.

Чакаецца, што падчас Алімпійскіх гульняў сталіцу Францыі наведаюць 16 мільёнаў турыстаў. Алімпіяда ў Парыжы пройдзе з 26 ліпеня да 11 жніўня.

## Прынц Дацкі стане каралём

**Каралева Даніі Маргрэтэ II нечакана абвясціла аб сваім адрачэнні ад трона, выступаючы з навагоднім тэлезваротам да нацыі. Афіцыйна адрачэнне адбудзецца 14 студзеня, калі споўніцца 52 гады з таго часу, як яна стала каралевай. Пасля сыходу Маргрэтэ каралём стане яе старэйшы сын, наследны прынц Фрэдэрык. Муж каралевы, французскі дыпламат і прынц-кансорт Хенрык памёр у 2018 годзе.**



83-гадовая Маргрэтэ II з'яўляецца самым доўгакіруючым манархам у гісторыі Даніі, яна ўзышла на трон пасля смерці свайго бацькі караля Фрэдэрыка IX у 1952 годзе. У адрозненне ад брытанскай каралеўскай традыцыі, афіцыйнай цырымоніі каранацыі 55-гадовага наследнага прынца Фрэдэрыка не будзе. Замест гэтага ў гэты ж дзень палац абвесціць аб яго ўзыходжанні на трон.

Прэм'ер-міністр Даніі Мэтэ Фрэдэрыксен ад душы падзякавала каралеве за доўгае і нястомнае служэнне каралеўству. AP адзначае, што Маргрэтэ II была папулярная, і многія датчане чакалі, што яна застанецца на троне да смерці, хоць у апошнія гады каралеўская сям'я, па прыкладзе іншых манархій Еўропы, вырашыла скараціць колькасць найсвятлейшых нашчадкаў, якія атрымліваюць дзяржаўны грант і выконваюць каралеўскія абавязкі. Гэта прывяло да публічнага расколу ў каралеўскай сям'і пасля таго, як дзеці малодшага брата наследнага прынца Фрэдэрыка, прынца Іаакіма, былі пазбаўлены сваіх каралеўскіх тытулаў.

## Дзясяткі мільёнаў амерыканцаў могуць застацца без інтэрнэту

**22 мільёны амерыканцаў могуць застацца без інтэрнэту напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у 2024 годзе. Пра гэта паведаміла Politico. У матэрыяле адзначаецца, што федэральнаму ўраду ЗША давядзецца згарнуць «Праграму даступнай сувязі», калі Кангрэс да вясны не зможа знайсці спосаб фінансавання, які дазволіць пакрываць выдаткі на інтэрнэт малазабяспечаным амерыканцам.**




«Праграма даступнай сувязі» дзейнічае з 2020 года. Яна была запушчана як часовая мера падчас пандэміі COVID-19, а пазней паўнацэнна замацавана Джо Байдэнам. Але цяпер дзяржаўнае субсідзіраванне шырокапалоснага інтэрнэту знаходзіцца пад пагрозай. Праграма апынулася ў «пастцы партыйнай вайны» паміж дэмакратамі, якія падтрымліваюць далейшае функцыянаванне праекта, і рэспубліканцамі, якія лічаць, што гэта дасць занадта моцную перавагу Байдэну пры пераабранні. Для цяперашняй адміністрацыі гэтая праграма вельмі выгадная ў палітычным плане і можа адыграць сваю ролю падчас выбараў. Прэзідэнт ЗША з часам жадае далучыць да праграмы яшчэ 30 мільёнаў сем'яў.

Паводле інфармацыі Politico, многія рэспубліканцы не вельмі давяраюць гэтай праграме. Яны сумняваюцца, што «дапамога сапраўды пашырае шырокапалосны доступ для амерыканцаў, якія маюць у ёй патрэбу, і, здаецца, падазраюць, што многія абаненты маглі б дазволіць сабе шырокапалосны доступ і без яе». Таксама яны падазраюць «Праграму даступнай сувязі» ў махлярстве, а федэральную камісію па сувязі ў бяздзейнасці. Напрыклад, у 2022 годзе больш за тысячу хатніх гаспадарак Аклахомы падпісаліся на праграму, выкарыстоўваючы асобу аднаго і таго ж чалавека. Старшыня Палаты прадстаўнікоў па энергетыцы і гандлі Кэці Макморыс Роджэрс заявіла: «Мы ўсё яшчэ вывучаем гэтае пытанне і спрабуем атрымаць больш інфармацыі аб тым, як былі выкарыстаны грошы».

Пры гэтым, на думку экспертаў, завяршэнне фінансавання можа згуляць супраць рэспубліканцаў, бо менавіта іх будуць абвінавачваць у тым, што 22 мільёны чалавек страцяць доступ у інтэрнэт. На думку Politico, спыненне праграмы можа негатыўна адбіцца на дачыненні малазабяспечаных амерыканцаў да дзейнай улады і на прэзідэнцкія выбары, запланаваныя на 5 лістапада 2024 года.

**Падрыхтаваў Захар БУРАК.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### ИНФОРМИРУЕТ о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «ТОРФОБРИКЕТНЫЙ ЗАВОД ДИТВА»

**Аукцион состоится 18.01.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 420/D-117510 (назначение: специальное жилое помещение, наименование: помещение гостиницы), общей площадью 142,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, аг. Дитва ул. Первомайская, д. 5, пом 4. Лот № 1: расположен на земельном участке, кадастровый № 423683202625000023, площадью 0,3503 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: аг. Дитва, ул. Первомайская, 5. Дитвянского сельсовета. Обременений со стороны 3-х лиц нет |
| **Начальная цена продажи** | 20 183 руб. (двадцать тысяч сто восемьдесят три рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 2 018 руб. (две тысячи восемнадцать рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 16.01.2024 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 29.12.2022 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70546 (наименование: ЗДАНИЕ ДЛЯ ОТКОРМА СКОТА; назначение: здание специализированное животноводства),** площадью 2047,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Радваничский с/с, 5, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001027553, площадью 1,4951 га, составные части и принадлежности: два выгульных дворика, площадка для складирования навоза, водонапорная башня, артскважина, погрузочно-разгрузочная рампа стационарная с весами

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 133 600,00 | Размер задатка, руб. | 13 360,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, 80162918159, тел./ф 80162918159. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** 100 % оплата в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 24 января 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 января 2024 г. до 17.00**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

